


КАРАНАВІРУС ПАЎСЮЛЬ У ЕЎРОПЕ І ЗША 4

ДАХ НАД ГАЛАВОЙ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ БАЦЬКОЎ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 САКАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 54 (29168)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У краіне стартуе пасяўная кампанія, і фактычна ўся тэхніка, а гэта 93 %, гатовая да пасяўной. Думаю, што з кожным днём гатоўнасць сельгастэхнікі будзе павялічвацца. Да таго ж перад галіной была пастаўлена канкрэтная задача выкарыстоўваць якасную энерганасычаную тэхніку і машынатрактары, якія прадпрыемствы атрымалі ў лізінг. Службам Дзяржтэхнагляду раёнаў, у сваю чаргу, трэба разам выбудаваць работу па рамонце і прапрацаваць якасныя падыходы да захоўвання, утрымання і эксплуатацыі тэхнікі. Маркую, мы выбудуем гэтую работу з раёнамі і абласцямі».*

# «Таму і люблю я Оршу першым вялікім каханнем...»




Гэтыя словы Уладзімір Караткевіч прысвяціў свайму роднаму гораду. І малая радзіма адказвае яму ўзаемнасцю — сёлета ўвосень Орша рыхтуецца адзначыць 90-годдзе пісьменніка. Ужо сёння на вясновых гарадскіх вуліцах можна пабачыць плакаты з выявай Караткевіча і яго цытатамі. Напрыклад, на гэтым, што вісіць у цэнтры, напісана асабліва важнае для кожнага сёння і заўсёды: «Усе шляхі прыводзяць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз...»

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## КОРАТКА

- **«Еўрабачанне» адмянілі з-за каранавіруса.**
- Урад часова забараніў вываз з Беларусі незалежна ад краіны іх паходжання некаторых медыцынскіх тавараў, сярод якіх аднаразовыя камбінезоны і касцюмы хімабароны, рэспіратары, хірургічныя халаты, маскі, бахілы, бінты, вата, марля, розныя віды медыцынскіх пальчатак.
- **Вытворчасць дыхальных масак адкрыта ў індустрыяльным парку «Вялікі камень». Заяўленая эфектыўнасць фільтрацыі — не ніжэй за 99,999 %. Пры гэтым іх можна выкарыстоўваць на працягу 12—24 гадзін.**
- Рысь справакавала ДТЗ у Рэчыцкім раёне.
- **Абноўленыя банкноты Br20 і Br50 будуць уведзены ў абарачэнне з 23 сакавіка.**

Спецыяльны рэпартаж

## Маскі, пальчаткі, антысептык і пытанне пра самаадчуванне

**Як працуе прапускны пункт на беларуска-польскай граніцы**




Фота Леаніда ШЧАГЛОВА.

СТАР. 4

## НА ЎЗРОЎНІ СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАЎ

Жыві і квітней, Беларусь! Здароўе. Практычны падыход

### Працуюць медыкі адной з галоўных бальніц Бабруйска

**Медыцынская дапамога павінна канцэнтравацца не толькі ў сталіцы, а быць максімальна набліжанай да насельніцтва рэгіёнаў — такую задачу ставіць перад Міністэрствам аховы здароўя Прэзідэнт. Мы ўжо неаднаразова пісалі пра тыя захады, якія робяцца для паляпшэння медыцынскага абслугоўвання ў Магілёўскай вобласці, і станоўчых прыкладаў менш не робіцца. Бабруйская цэнтральная бальніца, адна з найбуйнейшых у рэгіёне (па сутнасці, яна выконвае абавязкі былога гарздраўаддзела), акрамя горада абслугоўвае яшчэ і найбліжэйшыя раёны — Бабруйскі, Глускі, Кіраўскі, Асіповіцкі. Летась праз яе прыёмны пакой прайшло 39 276 чалавек. Карэспандэнт «Звязды» паназірала, якімі магутнасцямі валодае ўстанова і наколькі сучасныя тут прапануюць паслугі.**

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Трэнды

# ПІКЕ «ЧОРНАГА ЗОЛАТА»

## Чым абернецца нафтавы крызіс?



Фота БелТА

**Сённяшні крызіс на сусветным рынку нафты — прагназуемы трэнд, аб якім эксперты казалі яшчэ ў канцы мінулага года. Пра гэта ў прэс-цэнтры БелТА падчас чарговага пасяджэння праекта «Экспертнае асяроддзе» — «Нафта, каранавірус і новая рэальнасць» — заявіў аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (БІСД) Аляксей АЎДОНІН.**

### БЕЗ ПАНІКІ

Эксперт звярнуў увагу, што ў канцы 2019-га шэраг азіяцкіх, амерыканскіх і еўрапейскіх аналітычных цэнтраў у адкрытых публікацыях папярэджвалі пра надыходзячы ў найбліжэйшы час рэзкі спад цэн на нафту. «Мы назіраем трэнд, які пачаў рэалізоўвацца», — адзначыў Аляксей Аўдонін. Па яго словах, з 2019 года адчувалася, што тэмпы росту сусветнай эканомікі ў цэлым і Кітая ў прыватнасці пачынаюць падаць. Як вынік — зніжалася спажыванне энерганосьбітаў.

Падзенне цэн на нафту ў 2020 годзе чакалася, магчыма, не настолькі рэзкае. Але свае карэктывы ўнёс каранавірус. У лістападзе 2019-га ў Кітаі выявілі так званага нулявога, першага заражанага пацыента. «Пік прыйшоўся на студзень, калі многія аналітычныя цэнтры заявілі аб хуткім і досыць моцным падзенні эканомікі Кітая, аднаго з асноўных спажыўцоў нафты. Гэтыя інфармацыйныя паведамленні адбіваліся на дынаміцы энергетычных рынкаў», — звярнуў увагу аналітык БІСД. На думку Аляксея Аўдоніна, каб прагназаваць развіццё сітуацыі, трэба па магчымасці адкінуць эмоцыі, панічныя настроі і не рабіць імгненных высноў.

### ХІТРАЯ ЗДЗЕЛКА

**Прэс-сакратар канцэрна «Белнафтахім» Аляксандр ЦІШЧАНКА** падзяліўся сваімі назіраннямі за тым, што адбываецца на нафтавым рынку. «Выразна кідаецца ў вочы адна простая рэч: цэны падаюць, а буйных здзелак няма. Па сутнасці, мы не бачым выразных рухаў на рынку. Ёсць падзенне кошту акцый асобных кампаній, але нафта яшчэ нікуды не пайшла. Яшчэ ніхто не скарыстаўся момантам. Пакуль ідзе «прыстрэлка», — сказаў ён.

Што датычыцца прычын цяперашняга становішча, то, каб іх вызначыць, трэба шукаць, чые інтарэсы за ўсім гэтым стаяць. «У першую чаргу ў гэтай сітуацыі спрабуюць перарабіць, перакроіць рынак, стварыць і запоўніць нішы, — лічыць Аляксандр Цішчанка. — Сёння мы бачым бітву «падушкамі бяспекі». Кожны бок заяўляе, што ў яго хапае запасаў, рэсурсаў, сіл, каб доўга трымаць абарону, доўга дзейнічаць. Ніхто ў дадзеным выпадку пакуль не здаецца», — адзначыў эксперт. Ён лічыць, што сітуацыя ў хуткім часе прыме новы абарот. «Мне здаецца, ключ ад усіх праблем дзесьці побач. У найбліжэйшы час мы ўбачым больш хітрую здзелку ў сусветным маштабе», — адзначыў прадстаўнік «Белнафтахіма».

Аляксандр Цішчанка выказаў меркаванне, што буйныя гульцы нафтавага рынку маглі быць самі зацікаўлены ў крызісе. Размовы пра гэта ішлі ў кулуарах. «Па сутнасці, гэта перазагрузка, «вайна», маўляў, усё спіша, — лічыць ён. — Тое, што мы сёння маем на рынку, — гэта вынік планамерных дзеянняў. Паглядзім, хто выйграе. Зрэшты, як заўсёды, пацерпяць слабыя».

### ПЕРАЗДАЧА КАРТАЎ

**Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі Аляксей ДЗЕРМАНТ** звярнуў увагу на агульную тэндэнцыю дэглабалізацыі. «Буйныя гульцы гуляюць на разбурэнне глабальных сувязяў, ствараюцца панрэгіёны. Кожны спрабуе, з аднаго боку, замкнуцца, а з другога — уцягнуць у сваю сферу ўплыву большую колькасць слабейшых. Цяпер мы назіраем размежаванне, пасля якога, мяркую, ужо надыдзе працэс аб'яднання, але на зусім новых правілах. Таму што карты перараздадуць, і паўстануць ужо новыя моцныя гульцы», — лічыць прадстаўнік Інстытута філасофіі.

Аляксей Дзермант мяркуе, што найбольш падрыхтаванымі да новых рэалій будуць краіны, якія развіваюць звышхуткую сувязь, квантавы інтэрнэт, сістэмы аналізу вялікіх даных і тэхналогіі адсочвання. Апошнія дазваляюць, апроч іншага, кантраляваць стан здароўя вялікіх мас людзей. «Гэта тое, што будзе запатрабавана ў наступныя 10 гадоў. Краіны, якія гэтага не маюць, не будуць спраўляцца з тымі пагрозамі, якія мы зараз бачым. Той, хто такія тэхналогіі развіве, будзе падрыхтаваны да перараздачы карт у будучыні», — упэўнены эксперт.

Што датычыцца нафтавага рынку, то, на думку Аляксея Дзерманта, на першыя месцы будуць выходзіць альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, не завязаныя на глабальныя рынкі. «Кожная краіна зможа кантраляваць свой сегмент і не залежаць ад цэн, якія прапануюць канкурэнты альбо партнёры. Гэта, магчыма, атамная энергетыка, аднаўляльныя крыніцы энергіі, хоць трэнд яшчэ не настолькі відавочны», — адзначыў ён.

### СТРАТЭГІЧНЫ ФАРМАТ

У сваю чаргу, **аналітык БІСД Віталь ДЗЯМІРАЎ** пракаментаваў сітуацыю з пункту гледжання інтарэсаў Беларусі. «Нам выгадна купляць танную нафту, але роўна да той ступені, пакуль цэны на нафтапрадукты трымаюцца на высокім узроўні. Як правіла, гэты часовы лаг досыць невялікі. Як толькі цэны панізяцца, маржа акажацца не такая ўжо значная», — канстатаваў ён. У пошуках патэнцыйных пастаўшчыкоў нафты прапрацоўваюцца ключавыя стратэгічныя аспекты, звязаныя з інфраструктурай дастаўкі па альтэрнатыўных каналах.

Аляксандр Цішчанка расказаў аб стратэгіі развіцця нафтахімічнага комплексу да 2030 года. Яна прадугледжвае, што ААТ «Нафтан» будзе развівацца па нафтахімічным кірунку, а Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод захавае паліўны профіль. «Трэнды на тое, што «хімія» нікуды не дзенецца, у нас прадугледжаны. Яна ўсё роўна будзе прысутнічаць, нягледзячы на тое што з'явяцца электрамабілі, новыя віды энергіі, крыніцы і гэтак далей, — адзначыў Аляксандр Цішчанка. — Натуральна, трэба рабіць гэты фармат больш ёмістым і рэнтабельным». Стратэгія прадугледжвае мадэрнізацыю заводаў, яна завяршыцца ў найбліжэйшыя гады, дадаў прэс-сакратар канцэрна. Загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Сяргей Кізіма лічыць, што галіне варта пераарыентавацца на выторчасць высокатэхналагічных нафтахімічных тавараў. «Гэта будзе запатрабавана ў будучыні», — лічыць ён.

# ШТО РОБІЦЦА ДЛЯ БЯСПЕЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АЭС

## Стрэс-тэсты ENSREG, мабільны дызель-генератар і аварыйныя сцэнарыі

**Выпрабаванні атамнай станцыі на гатоўнасць да завозу ядзернага паліва і стан сейсмалагічнай і экалагічнай сітуацыі каля АЭС, прытрымліванне рэкамендацый МАГАТЭ і выкананне Нацыянальнага плана дзеянняў па выніках стрэс-тэстаў еўрапейскіх рэгулятараў па ядзернай бяспецы — гэтыя і іншыя пытанні, звязаныя з міжнародным супрацоўніцтвам падчас будаўніцтва Беларускай АЭС, за круглым сталом абмеркавалі спецыялісты.**

Агульная магутнасць беларускай энергасістэмы з улікам блока станцый незалежных вытворцаў энергіі — 10 098 МВт. З пачаткам работы атамнай станцыі да гэтай колькасці дадасца магутнасць двух рэактараў па 1200 МВт. Праект Беларускай АЭС знаходзіцца ў фінальнай стадыі будаўніцтва. У краіне створаны тысячы кіламетраў ліній электраперадачы высокага напружання, новая сучасная падстанцыя ў Паставах, мадэрнізаваны чатыры электычныя падстанцыі.

Калі краіна збіраецца будаваць першую атамную станцыю, яна павінна стварыць адпаведную інфраструктуру не толькі ў галіне камунікацый, але і па кірунках, якія вызначаны дакументам «Вехі», створаным спецыяльна для краін — навічкоў у атамнай галіне, сведчаць спецыялісты.

— Тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з МАГАТЭ ў сферы ядзернай энергетыкі цягнецца з 2007 года. У 2012-м місія Міжнароднага агенцтва ацэньвала нашу гатоўнасць яшчэ толькі да этапу будаўніцтва. Нядаўна місія ўжо разглядала інфраструктуру на этапе гатоўнасці да ўводу станцыі ў эксплуатацыю, — расказала **Лілія ДУЛІНЕЦ, намеснік дырэктара Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга.**

Па выніках ацэнкі развіцця і гатоўнасці ўсёй інфраструктуры краіны да пуску і эксплуатацыі АЭС для Беларусі выпрацавана пяць станоўчых практык, якія будуць рэкамендаваны іншым краінам, а таксама шэсць прапаноў і сем рэкамендацый. Спецыялісты МАГАТЭ падрыхтавалі па іх праект папярэдняй справаздачы. 27 сакавіка дакументы накіруюць беларускаму боку для каментарыяў і ўдакладненняў, якія не павінны закранаць фактычную частку (тэхналагічны змест). У канцы красавіка каментары беларускіх экспертаў будуць адасланы назад, і ўжо ў трэцім квартале 2020-га з'явіцца канчатковая версія справаздачы, якую плануюць апублікаваць у адкрытым доступе.

— Для Беларусі МАГАТЭ — гэта не проста грозны рэгулятар, а скарбніца сусветнага вопыту і ведаў у ядзернай сферы. Каб увабраць яго, краіна і запрашае ацэначныя місіі і рэалізоўвае ўсе іх рэкамендацыі. Прынцып «бяспека вышэйшая за ўсё» — абсалютны прыярытэт пры рэалізацыі ядзернай энергетычнай праграмы, — падкрэсліў **Павел БЕРТАШ, кансультант Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга.**

Вынікі замераў «нулявога фону», праведзеных на АЭС для ацэнкі радыеэкалагічнага ўздзеяння станцыі на наваколле, а таксама даследаванняў раслін, глебы, вады і агародніны на адлегласці ад станцыі вельмі важныя, упэўнены спецыялісты.

Параўноўваючы звесткі, якія будуць тут атрымліваць надалей, з вынікамі назіранняў у перадэксплуатацыйны перыяд, можна будзе казаць, што тэхналогія бяспечная і забяспечвае надзейную эксплуатацыю атамнай энергетыкі ў гэтым рэгіёне. І яна накіравана на вышэйшы ўзровень бяспекі, у тым ліку і для наступных пакаленняў, упэўнены расійскія эксперты.

Пасля запуску даследаванні працягнуць. Любыя змены ў тэхналогіі (пабудова новага блока, новае паліва) павінны быць нагодай для правядзення новых замераў, каб пацвердзіць, што радыеэкалагічная сітуацыя не змянілася, а тэхналогія была абрана правільная.

— Такія замеры служаць індыкатарам нязменнасці сітуацыі цягам усяго тэрміну эксплуатацыі АЭС, — падкрэсліў **Аляксей ЯКІДЗІН, дырэктар «Агенцтва экалагічнай бяспекі «Альфа-Х91».** — На падставе сабранага матэрыялу, дарэчы, ужо выпушчаны буклеты, дзе проста і падрабязна апісваецца, якія аб'екты даследавання і чаму ўключаны ў кантроль.

### Землятрусу і блэкаўту на АЭС не баяцца

Цэнтр геафізічнага маніторынгу НАН даследаваў сейсмічную з'яву 1908 года — так званы Гудагайскі землятрус, пра істотнасць якога дагэтуль ідуць спрэчкі. Цэнтр выканаў сур'ёзную навуковую работу, у якой паказаў, што гэта за сейсмічная з'ява, разлічыў кансерватыўным метадам паказчыкі, магнітуду, лічбу па шкале MSK-64 і іншыя, расказаў **Алег СОБАЛЕЎ, кансультант Дзяржатамнагляду:**

— Вынікі даследавання перадаздзены АЭС, каб можна было адкарэкціраваць каталог сейсмічных з'яў месца размяшчэння станцыі і іншыя дакументы, дзе фігуруюць раздзелы па сейсміцы. Аднак нельга сцвярджаць, што трэба па выніках гэтага даследавання пераглядаць праектныя асновы АЭС. Яна спраектавана, каб вытрымліваць землятрусы да сямі балаў.

Другое завершанае мерапрыемства — стварэнне на АЭС лініі і пункта стацыянарнага падключэння мабільнага дызель-генератара для першага энергаблока. Тое ж будзе зроблена і пад другі энергаблок. Задача дызель-генератара, які ўжо знаходзіцца на пляцоўцы будаўніцтва станцыі, — забяспечыць станцыю энергіяй падчас блэкаўту, калі яна будзе цалкам абясточана.

Яшчэ адзін рэалізаваны пункт Нацыянальнага плана — праграма работ па распрацоўцы і ўкараненні сімптомна-арыентаваных працэдур аварыйнага рэагавання. Гэты дакумент прайшоў верыфікацыю, а супрацоўнікі станцыі — навучанне. Па меры росту вопыту эксплуатацыі АЭС дакумент таксама будзе ўдасканальвацца. Усё, што звязана з выкананнем Нацыянальнага плана, публікуецца на сайце Дзяржатамнагляду, дадаў Алег Собалеў.

### Трэба быць гатовымі да ўсяго

Энергія ад АЭС будзе паступаць у энергасістэму краіны праз сем ліній электраперадачы. На станцыі праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, якія забяспечваюць рэзерваванне і надзейнасць работы энергаблокаў станцыі, расказаў **Уладзімір БАБРОЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер «Белэнерга»:**

— Мы прымаем шмат мер па выраўноўванні графікаў начной нагрузкі шляхам укаранення на ЦЭЦ і кацельных электракатлоў. Створаны электракатлы магутнасцю 80 МВт на Гомельскай ЦЭЦ-2. Летась уведзена цеплакрыніца з электракатламі на 200 МВт у Касцюковічах. Завяршаецца праект па ўстаноўцы электракатлоў на міні-ЦЭЦ «Паўночная» ў Гродне. У канцы сакавіка з выпрабаваннямі ў красавіку плануецца ўсталяваць электракатлы на мінскіх кацельнях ЦЭЦ-3, ЦЭЦ-2, ЦЭЦ-4. Магутнасць гэтых прылад будзе большая за 900 МВт, што дазволіць ноччу разгрузіць нашы энергетычныя магутнасці, якія працуюць на арганічным паліве.

17 лютага пачалася праверка гатоўнасці АЭС да прыняцця ядзернага паліва, якая скончылася 17 сакавіка. Адно з мерапрыемстваў, якія рэалізуюцца пры гэтым, — перагрузка імітатараў ядзернага паліва. Даты яго завозу пачнуць планаваць, калі ўсе структуры будуць на 100 % упэўнены, што ўсё будзе зроблена бяспечна, сцвярджаюць эксперты. Трэба разумець, што гатоўнасць АЭС прынясць у сябе свежае ядзернае паліва — цэлы комплекс мерапрыемстваў — ад месца, дзе яно будзе змяшчацца да пагружэння ў рэактар, і забеспячэння фізічнай абароны да вытрымлівання гарантый аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі і гатоўнасці беларускай чыгункі перавозіць ядзернае паліва. Хоць усё будзе рабіцца максімальна бяспечна, але трэба быць гатовымі да ўсяго, у тым ліку і да патэнцыйнага рэагавання, калі нешта пойдзе не так падчас транспарціроўкі паліва.

**Ірына СІДАРОК.**

# ТРАНЗІТУ НЯМА

## Не ўсе беларусы змаглі вярнуцца дадому пасля адпачынку за мяжой

**Учора сама меней 28 беларусаў не змагло вярнуцца дадому з-за таго, што Расія закрыла межы з нашай краінай і не дапускае на сваю тэрыторыю замежнікаў, у тым ліку беларусаў. Пяцёра вымушана затрымаліся ў Тайландзе, астатнія — у індыйскай правінцыі Гаа. Сярод турыстаў, якім не пашанцавала са зваротнай дарогай, ёсць пажылыя людзі і малыя дзеці.**



— Мы павінны былі ляцець рэйсам Гаа — Масква ў 7:00, — прыслала журналісту «Звязды» галасавое паведамленне праз «Вайбер» мінчанка Дар'я Тарасевіч. — Да таго ж у нас быў білет на самалёт Масква — Мінск, які павінен быў падняцца ў паветра ў 19.15. Але нас проста не пусцілі ў першы самалёт. Нас 23 чалавекі, і мы ўсе вельмі разгубіліся. Мы спадзяваліся, што пытанне вырашыцца хутка, звязваліся з консулам, званілі на тэлефоны даверу, тураператарам, але нам ніхто і нічога не мог сказаць пэўнага. Неўзабаве нас стала выганяць з аэрапорта паліцыя. Многія з нашай групы лічылі, што нам нельга пакідаць аэрапорт, маўляў, тады наогул не паляцім дадому. Людзі пачалі панікаваць, былі раздражнёныя і плакалі, але ў рэшце рэшт нас прымусілі сысці. Мы стварылі групу ў месенджары і абмяняліся кантактамі, каб быць на сувязі. Сама я вярнулася ў гатэль, у якім адпачывала раней. Мяне там прынялі добра і з разуменнем. Я ведаю, што многім даводзіцца шукаць начлег, шмат у каго пасля адпачынку амаль няма грошай.

Калі рыхтаваўся матэрыял, было вядома, што наша Міністэрства замежных спраў актыўна займалася вырашэннем сітуацыі, у якую ў выніку дзеянняў расійскага боку трапілі нашы суайчыннікі не толькі на Гаа. На афіцыйнай старонцы ў «Фэйсбуку» пасольства Беларусі ў Індыі змешчаны зварот да нашых грамадзян, якія знаходзяцца ў Індыі, Непале, Шры-Ланцы і Бангладэш. У ім людзей запэўніваюць, што «ўсе неабходныя каналы актывізаваныя», і просяць знайсці сябе ў спісе на сайце пасольства або дадаць туды сваё імя. «Нам вельмі важна ведаць аб усіх грамадзянах Беларусі», — адзначаюць дыпламаты.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Будзь у курсе!

## Рух цягнікоў у прыгранiччы зменены...

**Паводле распараджэння ўрада Расійскай Федэрацыі, з 0.00 гадзін 18 сакавіка да 0.00 гадзін 1 мая часова абмяжоўваецца ўезд у Расійскую Федэрацыю замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, у тым ліку якія прыбываюць з тэрыторыі Беларусі, а таксама грамадзян Рэспублікі Беларусь.**

У сувязі з такім рашэннем цягнікі Беларускай чыгункі, якія курсіруюць у пагранічных зносінах з Расійскай Федэрацыяй, з 18 сакавіка будуць прытрымлівацца змененых маршрутаў да апошняй прыгранічнай станцыі Рэспублікі Беларусь, паведамляе прэс-цэнтр нашай магістралі.

Так, цягнікі № 6641/6644, № 6643/6646 Віцебск — Рудня — Віцебск будуць курсіраваць па маршруце Віцебск — Завольша — Віцебск.

Цягнікі № 6184/6183, № 6186/6185 Орша — Краснае — Орша будуць рухацца па маршруце Орша — Асінаўка — Орша.

Цягнікі № 6545/6546 Крычаў — Сураж — Крычаў будуць курсіраваць па маршруце Крычаў — Бялынкавічы — Крычаў.

## ...а ў Казахстан прыпынены

**Чыгуначная адміністрацыя Казахстана апавясціла аб прыпыненні курсіравання міжнародных цягнікоў і бесперасадачных вагонаў.**

Як паведамляе прэс-цэнтр Беларускай чыгункі, адмяняюцца і не будуць курсіраваць:

цягнік № 318/317 Баранавічы — Караганды адпраўленнем з Баранавіч з 20 сакавіка, з Караганды — з 24 сакавіка;

бесперасадачныя вагоны Брэст — Караганды, якія курсіруюць у саставах цягнікоў № 650/318-317/649 адпраўленнем з Брэста, з 20 сакавіка, з Караганды — з 24 сакавіка;

бесперасадачны вагон Віцебск — Караганды, які курсіруе ў саставах цягнікоў № 605/318-317/602 адпраўленнем з Віцебска, з 20 сакавіка, з Караганды — з 24 сакавіка;

бесперасадачны вагон Гомель — Караганды, які курсіруе ў саставах цягнікоў № 83/318-317/55 адпраўленнем з Гомеля, з 20 сакавіка, з Караганды — з 24 сакавіка;

бесперасадачны вагон Магілёў — Караганды, які курсіруе ў саставах цягнікоў № 83/318-317/55 адпраўленнем з Магілёва, з 20 сакавіка, з Караганды — з 24 сакавіка.

## Алгарытм вяртання грошай той жа

**Нявыкарыстаныя праязныя дакументы на адмененыя цягнікі можна будзе вярнуць у білетных касах без дадатковых плат і збораў. Вяртанне грашовых сродкаў будзе адбывацца на падставе праязных дакументаў (білетаў).**

Вяртанне правазных плацяжоў па электронных праязных дакументах ажыццяўляецца праз інтэрнэт-рэсурс, на якім быў набыты праязны дакумент.

Тэрміны вяртання праязных дакументаў не абмежаваны.

БЧ просіць пасажыраў з разуменнем паставіцца да сітуацыі, якая склалася, і ўважліва сачыць за зменамі ў графіку руху цягнікоў.

Актуальную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў можна атрымаць на сайце www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах, з дапамогай афіцыйнай мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік» і па тэлефоне кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі 105 (падтрымка пасажыраў, якія знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь, — па тэлефоне +375 22 2 39 25 47).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пандэмія «закрыла» Еўрасаюз на каранцін




ЕС заявіў, што ў мэтах супрацьдзеяння далейшаму распаўсюджванню пандэміі знешнія межы саюза будуць закрытыя на працягу 30 дзён. Гэтае сумеснае рашэнне было прынята на агульным пасяджэнні Еўракамісіі і Еўрасавета. «Нас цалкам падтрымалі ўсе дзяржавы, практычнае ўвасабленне ўскладзена на адпаведныя службы краін — членаў Еўрасаюза. Рашэнне ўступае ў сілу неадкладна», — паведаміла старшыня Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен. Такія меры не маюць прэцэдэнту ў гісторыі супольнасці. Канцлер Германіі Ангела Меркель дадала, што цяпер патрабуецца «каардынацыя намаганняў па рэпатрыяцыі грамадзян краін, што ўваходзяць у Еўрасаюз, якія апынуліся за межамі супольнасці», і што ўдзельнікі дыскусій «маюць намер дапамагчы людзям вярнуцца ў максімальна кароткія тэрміны». Самая цяжкая сітуацыя ў Італіі, дзе на ўчарашні дзень было зарэгістравана больш за 31,5 тысячы выпадкаў заражэння і звыш 2,5 тысячы смерцяў ад COVID-19. У Францыі неапраўданае знаходжанне за межамі жылля будзе карацца штрафам у памеры 135 еўра, сачыць за выкананнем у краіне жорсткіх каранцінных мер будуць 100 тысяч праваахоўнікаў, а таксама вайсковыя патрулі. Падобная сітуацыя і ў Іспаніі, дзе на COVID-19 захварэла больш за 12 тысяч чалавек, звыш 500 памерла і амаль столькі ж знаходзяцца ў рэанімацыі на апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх. Найбольшай рызыцы заражэння падвяргаюцца ў сітуацыі пандэміі пажылыя людзі — менавіта сярод гэтай групы насельніцтва ўзровень смяротных зыходаў пакуль самы высокі.

### Пайшоў з жыцця Эдуард Лімонаў



Пісьменнік і палітык Эдуард Лімонаў памёр у шпіталі ў Маскве на 78-м годзе жыцця, паведаміў ТАСС дэпутат Дзярждумы, пісьменнік Сяргей Шаргуноў. Лімонаў пачаў журналісцкую дзейнасць у СССР у 1960-х, але ў 1974-м эмігрыраваў, жыў у ЗША і ў Францыі. На Захадзе выйшлі знакавыя раманы пісьменніка. Самы першы з іх, «Гэта я — Эдзічка», прынёс яму шырокую вядомасць на радзіме пасля публікацыі ў СССР у пачатку жніўня 1991 года. Нягледзячы на хваробу, Лімонаў да апошняга працягваў займацца пісьменніцкай дзейнасцю. 13 сакавіка на сваёй старонцы ў Facebook ён паведаміў, што напісаў кнігу «Стары падарожнічае» і заключыў дамову з выдавецтвам на яе публікацыю. «Акрамя таго, што Лімонаў быў выдатны пісьменнік, у яго фантастычная біяграфія, — такое меркаванне выказаў ТАСС рэктар Літаратурнага інстытута імя Горкага Аляксей Варламаў. — Не пра вельмі многіх сучасных рускіх пісьменнікаў было б цікава напісаць іх біяграфію з серыі «Жыццё выдатных людзей». «Вечны бунтар, ён умеў бударажыць розумы, эпатаваць публіку, ствараць новыя літаратурныя і паводзінскія формы», — зазначыў кіраўнік Расдруку Міхаіл Сеславінскі. Бывайце, Эдуард Веніямінавіч...

Молада — не зелена

# ШЛЯХ У НАВУКУ: ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

**Штогод на работу ў Нацыянальную акадэмію навук прыходзіць больш за 300 маладых спецыялістаў. З іх каля 70 % папаўняюць шэрагі даследчыкаў. Кожны трэці навуковы работнік у акадэміі мае ўзрост да 35 гадоў. Такія лічбы агучыў на адкрыцці форуму навуковай моладзі «Шлях у навуку» першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК.**



Сёння ў НАН Беларусі рэалізуецца комплекс мер па матэрыяльнай падтрымцы і стымуляванні маладых навукоўцаў. Для выпускнікоў аспірантуры гэта, напрыклад, першачарговае права на выдзяленне жылля; забеспячэнне першага рабочага месца, а таксама гарантый і кампенсацый у сувязі з размеркаваннем. Заснаваны шэраг прэмій для маладых навукоўцаў — у прыватнасці, прэмія імя першага прэзідэнта Акадэміі навук Ігнатоўскага, імя акадэміка Купрэвіча, імя акадэміка Алфёрава.

У мэтах фінансавай падтрымкі даследаванняў і садзейнічання своечасоваму іх завяршэнню штогод праводзіцца конкурс сярод дактарантаў, аспірантаў і суіскальнікаў на атрыманне грантаў для выканання навукова-даследчых работ па тэме дысертацыі.

Арганізатарам форуму «Шлях у навуку» выступіў Савет маладых вучоных НАН. Мэта мерапрыемства — павышэнне эфектыўнасці і ініцыятыўнасці маладых навукоўцаў пры правядзенні навуковых даследаванняў, а таксама развіццё лідарскіх якасцяў для рэалізацыі самастойных навуковых праектаў.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі навуковых арганізацый НАН Беларусі, вышэйшых навучальных устаноў краіны, магістранты, аспіранты і навучэнская моладзь.

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

На слыху

# Толькі дзевяць пацыентаў маюць клінічныя праявы

## У астатніх каранавірус працякае без сімптомаў

**У Беларусі зафіксаваны ўжо 51 выпадак каранавіруса. Пяць пацыентаў папраравіліся і выпісаны, астатнія знаходзяцца ў стацыянарах. Толькі дзевяць з іх маюць клінічныя прыкметы інфекцыі COVID-19, астатнія знаходзяцца пад медыцынскім назіраннем без клінічных праяў.**

— Выпісана пяць пацыентаў, яшчэ траім праводзіцца паўторнае лабараторнае абследаванне і яны рыхтуюцца да выпіскі ў найбліжэйшы час, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.** — За ўвесь гэты час у нас 17 завозных выпадкаў, у тым ліку апошнія чатыры — з Іспаніі, Францыі, Германіі і Санкт-Пецярбурга — выяўлены на санітарна-каранцінных пунктах. Астатнія выпадкі выяўлены ў выніку санітарна-эпідэміялагічных мерапрыемстваў у кантактаў першага ўзроўню.

Працягваецца медыцынскае назіранне за 1960 грамадзянамі, якія прыбылі з эпідэміялагічна неспрыяльных краін, для 2,7 тысячы чалавек такі двухтыднёвы кантроль завершаны.

— Міністэрства распрацавала загады па арганізацыі медыцынскай дапамогі, перапрафіляванні і функцыянаванні нашых медыцынскіх устаноў у залежнасці ад эпідэміялагічнай сітуацыі і колькасці выяўленых пацыентаў з РНК віруса. Меры, прынятыя цяпер, праведзены загадзя ва ўсіх рэгіёнах, аж да цэнтральных раённых бальніц, — звярнула ўвагу Юлія Барадун.

Яна падкрэсліла, што ложкавага фонду для арганізацыі дапамогі пацыентам з выяўленай РНК віруса і для ізаляцыі кантактаў першага ўзроўню дастаткова.

Тым часам наша РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі атрымала адказ з Германіі, што тэсты, праведзеныя ў лабараторыях нашай краіны, цалкам адпавядаюць нарматывам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Згодна з парадкам, прынятым у сістэме аховы здароўя, якасці дыягностыкі даецца знешняя ацэнка. Таму пяць першых станоўчых і 10 адмоўных тэстаў былі накіраваны па лініі Глабальнай сеткі назірання за грыпам у Супрацоўны цэнтр Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па ўзнікаючых інфекцыях і біялагічных пагрозах (Інстытут імя Роберта Коха) у Германіі.

Даследаванні ўзораў тэстаў, праведзеныя ў Інстытуце імя Роберта Коха, цалкам пацвердзілі атрыманыя ў РНПЦ вынікі.

У свеце больш за 198 тысяч чалавек заразілася каранавірусам, колькасць лятальных выпадкаў павялічылася да 7,9 тысячы, папраравіліся амаль 82 тысячы чалавек. У Кітаі па-ранейшаму фіксуецца зніжэнне захварвальнасці — усяго 13 новых выпадкаў за суткі. У Еўропе тым часам не засталося ніводнай краіны, вольнай ад віруса. Да 17 сакавіка адзінай такой краінай была Чарнагорыя, але і там выявілі два выпадкі. Цэнтрам пандэміі ў Еўропе застаецца Італія — там больш за 31,5 тысячы хворых, на другім месцы Іспанія — амаль 12 тысяч інфіцыраваных.

У ЗША таксама не засталося ніводнага штата, дзе б не фіксаваўся COVID-19. Апошні «паў» штат Заходняя Вірджынія, дзе таксама зафіксавалі першы выпадак. У Злучаных Штатах больш за 6,3 тысячы хворых.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Маскі, пальчаткі, антысептык і пытанне пра самаадчуванне

**Пункт пропуску «Брузгі» на беларуска-польскай граніцы сустракае цішынёй. З-за каранавіруса суседзі забаранілі ўезд. Тут няма звыклых легкавікоў. Актыўна рухаецца ў абодва бакі толькі паток фур, які, нягледзячы на ўсю сітуацыю ў Еўропе, практычна не зменшыўся. «Мяжу прайшоў досыць хутка», — адзначае беларускі дальнабойшчык Дзмітрый, які едзе з грузам з Бельгіі. Кіроўца не здзіўляецца таму, што пагранічнік на ўездзе ў краіну перш за ўсё пацікавіўся, як мужчына сябе адчувае. Гэта частка адпрацаванай працэдуры, з якой азнаёміліся і карэспандэнты БелТА.**



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА.

«Калі чалавек вяртаецца з эпідэміялагічна небяспечнай краіны, то з ім працуем ужо мы», — расказвае **памочнік урача-эпідэміёлага Веранiка ПЫШКО.** Спецыялісты Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя дзяжураць у пункце пропуску кругласутачна.

Чалавека выводзяць з агульнай плыні пасажыраў, яму мераюць тэмпературу, бяруць мазкі на аналіз. Абавязкова запаўняецца спецыяльная анкета, дзе паведамляецца ўся неабходная кантактная інфармацыя.

Пры найменшых сімптомах, напрыклад павышанай тэмпературы, кашлі або нават скаргах на недамаганне тых, хто прыехаў з іншых краін, у пункт пропуску выклікаюць хуткую дапамогу, пацыента шпіталізуюць. Такія выпадкі былі нават у пункце пропуску «Брузгі». Напрыклад, у бальніцу даставілі аднаго з кіроўцаў вялікагруза. Цяпер мужчына на каранціне. Пададуд да бяспекі ў пункце пропуску сур'ёзны. Пагранічнікі сустракаюць падарожнікаў у масках і пальчатках. На кожным пасту — дазатары з антысептыкамі. Апрацоўка рук — пасля кожнага пашпарта.

«Пагранічнікі працягваюць узмоцнены санітарна-каранцінны кантроль. Усе супрацоўнікі ў дастатковай колькасці забяспечаны неабходнымі сродкамі індывідуальнай абароны», — падкрэслівае **афіцыйны прадстаўнік Гродзенскай пагранічнай групы Надзея МАСЕВІЧ.**

У Гродзенскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя расказваюць, што колькасць людзей, агляд якіх праводзіцца, паменшылася ў апошнія дні ў некалькі разоў. Звязана гэта з закрыццём суседзямі граніц. За адны суткі ў чатырох пунктах пропуску (у «Брузгах» і «Бераставіцы» на польскім напрамку і ў «Прывалцы» і «Каменным Логу» на літоўскім) абследавана каля 550 чалавек, з іх 116 з эпідэміялагічна небяспечных краін. Большасць з іх — дальнабойшчыкі.

«Я сорак гадоў за рулём, а такога напружання ў Еўропе не згадаю. Радыё ўключыш і чуеш пра каранавірус. Крамы зачыненыя, ежу ў кавярні пры дарозе прадаюць толькі на вынас. А яшчэ некаторыя дзялкі ў крамках паднялі цэны», — кажа дальнабойшчык Алег.

Мужчыну, як і многіх яго калег, турбуе, як адаб'ецца каранавірус на іх сферы, ці будзе работа. У яго польскай фірме кажуць, што заказаў у найбліжэйшы час можа стаць менш. «З іншага боку, я зараз вязу абсталяванне для сельгастэхнікі з Германіі ў Расію. Ведаеце, вірус ці не, але есці трэба», — адзначае ён. А да таго, што на граніцы мераюць тэмпературу, ставіцца спакойна. Прафілактыка — важная справа. Праўда, мужчына з гумарам дзеліцца рэцэптам — тым, хто не за рулём, варта народныя метады выкарыстоўваць.

У «Брузгах» часова адкрылі і рух для пешаходаў. Часцей за ўсё гэтым карыстаюцца грамадзяне Беларусі, якія затрымаліся ў Еўропе, бо авія-, чыгуначныя і аўтобусныя рэйсы паміж краінамі адмянілі. Праўда, іх зусім няшмат — за некалькі гадзін граніцу перасекла крыху больш за дзесяць чалавек. Тых, хто вярнуўся з эпідэміялагічна небяспечных краін, дадаткова праверылі.

Дарэчы, лабараторна пацверджаны выпадак каранавіруса ў Гродзенскай вобласці быў выяўлены менавіта дзякуючы адладжанай рабоце на граніцы. Вірус знайшлі ў жанчыны, якая 9 сакавіка прыбыла з Італіі. Яе кантакты першага ўзроўню ізаляваны і знаходзяцца пад наглядам у інфекцыйнай бальніцы. Першыя вынікі даследаванняў адмоўныя. Усе гэтыя людзі адчуваюць сябе добра. Пад наглядам яны будуць знаходзіцца да кантрольных даследаванняў на 13—14-ы дзень.

**Сяргей ГАЎРЫЦКІ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СПОРТ НА ПАЎЗЕ

## Міжнародная федэрацыя хакея адмяніла чэмпіянаты свету ў групах А і В з-за пандэміі каранавіруса

**Турніры планавалася правесці з 27 красавіка да 3 мая ў Славеніі і Польшчы. Рашэнне па форуме ў эліце афіцыйна яшчэ не прынята, аднак віцэ-прэзідэнт ІІХФ Калерва КУМОЛА заявіў, што чэмпіянат свету — 2020 не будзе згуляны ў маі ў Швейцарыі. «Мы яшчэ чакаем афіцыйнага рашэння швейцарскіх улад, але ясна, што чэмпіянат свету сапраўды не будзе згуляны ў маі. ІІХФ вырашае дзелавыя пытанні са страхавымі кампаніямі. Калі ўсё будзе вызначана, зробяць афіцыйную заяву».**

«Магу дакладна сказаць, што мы не будзем пераносіць чэмпіянат свету, як гэта зрабіла УЕФА з чэмпіянатам Еўропы. Пераносіць яго са Швейцарыі няма сэнсу, таму што праблема каранавіруса ёсць усюды. У мяне практычна няма сумненняў у тым, што мы не зможам правесці турнір, гэта вельмі сумна», — заявіў, у сваю чаргу, **кіраўнік ІІХФ Рэнэ ФАЗЭЛЬ.**

У свеце адменена або перанесена ўжо больш за 100 спартыўных спаборніцтваў, у тым ліку чэмпіянат Еўропы па футболе, камандны чэмпіянат свету па спартыўнай хадзе, адборачныя турніры да Алімпіяды-2020.

Міжнародны алімпійскі камітэт правёў кансультацыі з міжнароднымі федэрацыямі па відах спорту і апублікаваў афіцыйнае камюніке. У МАК лічаць сітуацыю з распаўсюджваннем каранавіруса беспрэцэдэнтнай. Міжнародны алімпійскі камітэт салідарны з усёй сусветнай супольнасцю і прымае неабходныя меры, каб спыніць распаўсюджванне інфекцыі. Сітуацыя вакол віруса COVID-19 таксама ўплывае на падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў у Токіа-2020 і змяняецца кожны дзень. Але МАК па-ранейшаму адданы мэце правесці спаборніцтвы ў Токіа ў 2020 годзе. З улікам таго, што да Гульняў застаецца больш за чатыры месяцы, яго кіраўнікі лічаць, што няма неабходнасці прымаць нейкія радыкальныя рашэнні на гэтым этапе і любыя спекуляцыі ў цяперашні момант былі б контрпрадукцыйныя. МАК заклікае ўсіх спартсменаў працягваць рыхтавацца да Алімпіяды.

На падставе рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя Беларусі, накіраваных на процідзеянне распаўсюджвання каранавіруса COVID-19, Міністэрства спорту і турызму прымае меры па забеспячэнні кантролю за правядзеннем спартыўных і спартыўна-масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі нашай краіны. У прыватнасці, усім арганізацыям, падпарадкаваным Мінспорту, а таксама абласным і Мінскаму гарадскому ўпраўленням спорту і турызму рэкамендавана да 6 красавіка адмяніць правядзенне з наступным пераносам на пазнейшыя тэрміны спартыўных і спартыўна-масавых мерапрыемстваў з удзелам дзяцей і падлеткаў. Рэкамендацыі распаўсюджваюцца і на міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы на тэрыторыі Беларусі.

Ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам аховы здароўя арганізаваныя каранцінныя мерапрыемствы і медыцынскае назіранне за спартсменамі і спартыўнымі дэлегацыямі, якія вяртаюцца з краін з павышанай рызыкай інфіцыравання COVID-19. Па прыбыцці ў Беларусь у пунктах пропуску цераз дзяржаўную граніцу члены дэлегацыі падлягаюць санітарна-каранціннаму кантролю з выкарыстаннем прылад для дыстанцыйнага вымярэння тэмпературы цела, запаўненнем «Анкеты прыбылага», лабараторным абследаваннем на інфекцыю COVID-19. За імі ўсталёўваецца бесперапыннае 14-дзённае медыцынскае назіранне ў месцах часовага размяшчэння. Пры гэтым адмоўны вынік лабараторнага даследавання не адмяняе 14-дзённага медыцынскага назірання.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Каранавірус «Базару» не перашкода

**Ніхто з зорак не адмовіўся з-за каранавіруса прыехаць на Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Ні адзін канцэрт, выстаўка, прэзентацыя, паказ, спектакль не адменены. Падрыхтоўка да 29-га фестывалю, які пройдзе з 13 да 21 ліпеня, вядзецца ў штатным рэжыме. Пра гэта паведаміў учора на прэс-канферэнцыі дырэктар фестывалю Глеб ЛАПІЦКІ.**

Адзіная карэкціроўка ў сувязі з распаўсюджваннем інфекцыі — прыпынены продаж білетаў на праект «Зоркі «Еўрабачання»», які запланаваны на 18 ліпеня. Кіраўнік дырэкцыі тлумачыць гэта праблемай непрадказальнасці ў арганізацыі пасажырскіх перавозак. А трэба ж будзе даставіць у Віцебск у кароткі тэрмін зорных удзельнікаў менавіта гэтага шоу з краін далёкага замежжа.

Каб забяспечыць прыбыццё і адбыццё іншых зорак, арганізатары «Базару» наўпрост супрацоўнічаюць з Еўрапейскім вяшчальным саюзам. Вопытныя арганізатары прадумваюць лагістыку.

Што датычыцца конкурсаў юных і маладых выканаўцаў «Базару», то нацыянальныя адборачныя туры праведзены раней, чым вірус мог гэтаму перашкодзіць, таму яны таксама маюць адбыцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НЕ БАЯЦЦА «ЧОРНАЙ РУКІ»

*...Пачварны павук задае герою загадку: «Што на свеце мілейшае за ўсё?» — «Васіліса!» — адказвае заканы хлопец, і павуцінне пачынае яго душыць. «Жыццё! Жыццё на свеце за ўсё мілейшае!» — даходзіць да героя. Чорна-белы фільм-казка «Васіліса Прыўкрасная» быў зняты амаль 80 гадоў таму, а гэты эпізод актуальны і ў нашы дні. Дакладней, асабліва ў нашы дні, калі навіны пра пандэмію каранавіруса, афіцыйныя звесткі і каментары дзяржаўных устаноў, галасы экспертаў, рэплікі блогераў і прыдумкі форумных троляў зліваюцца ў вялізную і нястрымную інфармацыйную плынь, у якой, здаецца, вось-вось захлынешся і паніка накрые цябе па макаўку.*

*Яшчэ дзіцем, паглядзеўшы згаданы вышэй фільм, я задумалася: калі жыццё на свеце за ўсё даражэйшае, то што ў наш, дзякаваць Богу, мірны час за ўсё страшнейшае? Шмат варыянтаў перабірала, пакуль з узростам змяняліся пэўныя арыенціры і каштоўнасці. Цяпер, здаецца, ведаю адказ. Самае страшнае — спусташальнае адчуванне бездапаможнасці, калі тваім блізкім дрэнна, балюча, небяспечна, а ад цябе нічога не залежыць. Калі зусім маленькае дзіця енчыць ад болю, аж заходзіцца, але не можа расказаць і растлумачыць, дзе баліць, і застаецца толькі чакаць медыкаў, да хрусту сціскаючы рукі. Калі дачцэ ўліваюць лекі праз катэтар, след ад якога застанецца потым надоўга. Калі пасярод ночы маму першы раз забірае «хуткая» з прыступам. Калі бацькаў сябар тэлефануе з работы і расказвае, што тата паламаў абедзве нагі...*

*Тое, што адбываецца цяпер, падобна на гісторыі пра «чорную-чорную руку», якія мы расказвалі адно аднаму ў дзяцінстве ў піянерскіх летніках. Толькі гэтым разам усё больш сур'ёзна, бо цалкам рэальна і блізка. Калі першыя захварэлыя на новы каранавірус былі выяўленыя ў Кітаі, свет, здаецца, яшчэ не зразумеў, што адбываецца. Але вірус рушыў па планеце імкліва і няўхільна, і навіны пра яго ўсё больш нагадвалі звесткі з фронту: першыя выпадкі заражэння ў Еўропе, у суседніх з намі краінах, у Беларусі, у тваім горадзе, на тваёй вуліцы...*

*Усе краіны свету прымаюць пэўныя захады па рэкамендацыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у залежнасці ад складанасці сітуацыі — ад стрыманых да самых жорсткіх мер. А людзі застаюцца самі сабой і, калі не ўлічваць стадны інстынкт, рэагуюць на крызісныя абставіны, якія склаліся, і спраўляюцца з панікай па-рознаму. Адны рванулі за горад, пакуль яго наогул не закрылі для выезду, другія селі на каранцін і падтрымліваюць адно аднаго, а таксама медыкаў, спяваючы з балконаў нацыянальны гімн і папулярныя мелодыі, трэція сышлі ў добраахвотную самаізаляцыю, пакуль сітуацыя не зменіцца да лепшага, і перайшлі на дыстанцыйную работу і навучанне, чацвёртыя працягваюць жыць у звычайным рытме, не зніжаючы сацыяльнай актыўнасці, пятыя накупілі ў крамах прадуктаў доўгатэрміновага захоўвання і сродкаў гігіены, шостыя зладзілі валанцёрскія суполкі па дапамозе пажылым і састарэлым людзям як самым уразлівым у дачыненні да новага віруса...*

*Зрэшты, ёсць і добрая навіна. У адрозненне ад міфічнай «чорнай рукі», страшнай сваёй недаступнасцю і непрадказальнасцю, мы маем інфармацыю, што і як рабіць, ледзь не з кожнага праса — і гэта правільна! — паведамляюць пра меры прафілактыкі, падказваюць адрасы, куды звярнуцца ў тым ці іншым выпадку. Ды што там — беларусы нават станцавалі супраць каранавіруса. Міжнародная арганізацыя па міграцыі падтрымала сацыяльны флэшмоб #handwashdance аб правілах асабістай гігіены і паводзін падчас пандэміі, у якім сярод жыхароў розных краін паўдзельнічалі і мінскія танцоры. Іх відэа ў TikTok паглядзела ўжо больш за 3,3 мільёна чалавек. Гэтымі ж днямі беларускія выканаўцы здымаюць новае музычнае відэа «No Panic», каб падтрымаць суайчыннікаў і не паддавацца страху.*

*І, мабыць, вось яно, важнае, — нават знаходзячыся на адлегласці, падтрымліваць адно аднаго маральна, якія б меры засцярогі ні абраў кожны з нас. Многія межы закрыліся, але тэлефоны і інтэрнэт дазваляюць перадаць пажаданні здароўя і цёплыя словы, якіх, магчыма, менавіта цяпер не хапае нашым блізкім.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

Выпуск № 6 (142)


Жыві і квітней, Беларусь! Наш дом

# «УСЁ Ў НАС БУДЗЕ!»





## Дзяржава не раздае кватэры бясплатна, але дапамагае шматдзетным пабудаваць жыллё

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Жыллёвае пытанне лічыцца адным з самых вострых у нашай краіне. Пра падтрымку шматдзетных сем'яў кажуць так многа, і з'яўляецца адчуванне, што быццам кватэры атрымліваюць толькі шматдзетныя. Але калі быць аб'ектыўным, то ў 2019 годзе арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 46,9 тысячы новых кватэр, і толькі крыху больш за 10,3 тысячы для шматдзетных сем'яў. На самай справе, не так ужо і шмат, але гэта вялікая падтрымка. І хоць па сутнасці шматдзетныя складаюць каля пяці працэнтаў ад усіх сем'яў з дзецьмі, менавіта на іх адрас часам гучаць крыўдныя словы: маўляў, «нараджаеце дзеля кватэр» або «атрымалі кватэру на халяву». Сям'я Савічавых выхоўвае чатырох дзяцей: васьмігадовую Ганну, шасцігадовага Сашу, чатырохгадовага Аляксея і двухгадовага Арцёма. У студзені яны пераехалі ў дзве новенькія кватэры: аднапакаёвую і двухпакаёвую на адной лесвічнай пляцоўцы. Маладая сям'я запрасіла журналістаў да сябе ў госці, расказала пра тое, з якімі праблемамі сутыкнулася пры будаўніцтве жылля і як усё ж такі сталі шчаслівымі навасёламі.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Што ў кашальку

# У фантазіі няма меж, у фінансаў — ёсць

**Пастаноўка фінансавых мэт — гэта магчымасць на практыцы вучыцца арыентавацца ў сітуацыі, дзе ёсць пераменныя «хачу» і «магу сабе гэта дазволіць». Некаторыя нават лічаць наяўнасць фінансавых мэт прыкметнай паспяховасці чалавека.**

### ПЯЦЬ КРОКАЎ ДА ВЫНІКУ

Перш за ўсё трэба вызначыцца з жаданнямі. Тут у кожнага яны свае — набыць машыну, кватэру ці з'ездзіць у вандроўку мары, назбіраць на вучобу дзецям, вывучыць замежную мову ці яшчэ нешта. Але проста напісаць ці падумаць, чаго ты жадаеш, — недастаткова. Апісанне павінна быць падрабязнае, чым больш дэталяў, тым лепш.

Правільна сфармуляваць мэту — толькі пачатак і першы крок да яе здзяйснення. Наступным этапам будзе распрацоўка плана па дасягненні задуманага і жаданага. Умоўна мэты можна падзяліць на некалькі відаў (па часе іх дасягнення) — кароткатэрміновыя (да 1 года), сярэднетэрміновыя (ад 1 да 3-5 гадоў) і доўгатэрміновыя (ад 5 і больш гадоў).

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гэта здорава!

## БЯСПЛАТНАЯ ГАДЗІНА СПОРТУ ДЛЯ БАЦЬКОЎ І ДЗЯЦЕЙ



**Маладзёжны сямейны праект, скіраваны на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, адказнага бацькоўства і сямейных каштоўнасцяў, прапанаваны арганізацыяй БРСМ, ахапіў амаль усю краіну. Прыйсці ў «ТатаЗалу» і правесці «спартыўную гадзіну» са сваім малым ужо можна ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў адміністрацыйных раёнах сталіцы. Ідэю беларускай моладзі падтрымалі нават у Расіі і Украіне — «ТатаЗалы» там з'явіліся ў Тальяці і Кіеве.**

З ініцыятывай актыўнага адпачынку, калі таты разам з дзецьмі падцягваюцца на турніках, лазяць па шведскай сцэнцы, гуляюць у футбол ці адцiскаюцца ад падлогі, яшчэ два гады таму выступіла гомельская моладзь. Прапанова выклікала цікавасць па ўсёй краіне, і «ТатаЗалы» пачалі стварацца на базе спарткомплексаў і спартзал школ у розных гарадах. Іх цяпер больш за сотню.

Такія бясплатныя заняткі спортам у суботу для многіх сем'яў сталі прывабным спосабам актыўнага адпачынку, тым больш што прыйсці можна ў любую «ТатаЗалу», незалежна ад месца пражывання. Гэта зручна, бо заняткі ў пэўнай установе адбываюцца ў вызначаную гадзіну.

— Мы прымаем не толькі татаў, мамы таксама могуць прыйсці і пазаймацца спортам са сваімі дзецьмі. Калі ж нехта спазняецца, заўжды можна дамовіцца і крыху змясціць час, — кажа **Віялета ГАРДЗЕЙЧЫК, першы сакратар Савецкай раённай арганізацыі БРСМ Мінска.** — Праект скіраваны менавіта на тое, каб даць магчымасць бацькам і дзецям рабіць нешта агульнае разам, на гэта арыентуюцца і трэнеры.

Заняткі адаптаваны пад магчымасці дзяцей і падбіраюцца такім чынам, каб яны маглі рабіць тое ж, што і дарослыя: размінка, расцяжка, базавыя практыкаванні, заняткі на трэнажорах.

Такім чынам, у «дзіцяча-татаўскай трэнажорцы» бацькі могуць сумяшчаць прыемнае з карысным. У БРСМ адзначаюць, што праект доўгатэрміновы, і завяршаць яго не намерваюцца.

**Ірына СІДАРОК.**

**Адрасы і час работы сталічных «ТатаЗал»:**

Цэнтральны раён — фізкультурна-аздараўленчы цэнтр Цэнтральнага раёна: вул. Л. Карастаянавай, 41, з 10.00 да 11.00.

Фрунзенскі раён — сярэдняя школа № 59: вул. Лідская, 8, з 10.00 да 11.00.

Партызанскі раён — фізкультурна-аздараўленчы цэнтр Партызанскага раёна: зав. Уральскі, 9, з 11.00 да 12.00.

Савецкі раён — фізкультурна-аздараўленчы цэнтр дзяцей і моладзі Савецкага раёна: вул. Гамарніка, 7/2, з 12.00 да 13.00.

Маскоўскі раён — сярэдняя школа № 26: вул. Льва Сапегі, 15, з 12.00 да 13.00.

Першамайскі раён — фізкультурна-аздараўленчы цэнтр Першамайскага раёна: вул. Нікіфарава, 49, з 13.00 да 14.00.

Кастрычніцкі раён — фізкультурна-аздараўленчы цэнтр Кастрычніцкага раёна: вул. Брэсцкая, 90, з 14.00 да 15.00.

Добрая навіна

## У Маладзечне з'явіцца новы загс

**Ён размесціцца на скрыжаванні вуліц Віленскай і Льва Талстога, побач з цэнтральнай плошчай. У канцы мінулага года адбылося грамадскае абмеркаванне па пытаннях будаўніцтва. Спецыялісты і звычайныя гараджане змаглі ўнесці свае прапановы, выказацца ў падтрымку праекта.**

Гэта будзе двухпавярховы будынак агульнай плошчай 2213 квадратных метраў. На першым паверсе плануецца размясціць гардэроб, вестыбюль, малую залу грамадзянскіх абрадаў і канферэнц-залу, пакоі жаніха і нявесты, а таксама прыёмную і залу для наведвальнікаў, службовыя кабінеты. На другім паверсе прадугледжваецца вялікая зала для грамадзянскіх абрадаў, банкетная зала, веранда, балкон для музыкантаў.

Каля будынка будуць уладкаваны пад'язная пляцоўка для наведвальнікаў, пляцоўка для збору цвёрдых бытавых адходаў, фотазона з малымі архітэктурнымі формамі і арт-аб'ектамі, аўтамабільная паркоўка на 50 машын.

Аб'ект уключаны ў абласную інвестыцыйную праграму на 2020-ы. Ужо распрацоўваецца праектная дакументацыя. Пачатак будаўніцтва запланаваны на 2021 год.

Цяпер загс знаходзіцца ў прыбудаваным да жылога дома памяшканні.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Чыё дзіця?

# ПЕРАМОЖНАЕ ШЭСЦЕ ГЕНЕТЫКІ

## Наколькі дакладны ДНК-тэст на бацькоўства

**Жанчыну зацікавіў чатырохгадовы хлопчык з імем Эрык. Ён жыў у дзіцячым доме ўжо некалькі гадоў. Маці яго памерла, родных знайсці не ўдалося.**

**«Але ж імя... Імя малога нейкае нямецкае!» — думала жанчына. Яна якраз прыехала з Германіі ў Беларусь з гуманітарнай місіяй у якасці перакладчыцы. Бачыла ўжо шмат розных дзяцей і чула шмат гісторый, але гісторыя гэтага хлопчыка з галавы не выходзіла. Перакладчыца вырашыла падрабязней даведацца пра маці Эрыка. Высветлілася, што яна працавала ў Германіі, прыехала ў Беларусь вырашаць нейкія справы з дакументамі і памерла. Так Эрык аказаўся ў дзіцячым доме. Перакладчыца стала шукаць людзей, якія ведалі яго маці ў Германіі. Праз два гады знайшоўся такі мужчына. Ён прыехаў у Беларусь, каб зрабіць ДНК-тэст. Экспертыза пацвердзіла бацькоўства. Так маленькі Эрык перастаў быць сіратой і паехаў з татам дадому ў Германію... Такія гісторыі надоўга ўразаюцца ў памяць, лічыць намеснік начальніка аддзела генетычных экспертыз цэнтральнага апарата Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Мікалай КУЗУБ. Ён расказаў, наколькі дакладныя сучасныя ДНК-тэсты і чаму важна рэгістраваць сваіх дзяцей своечасова.**

— Да 90-х гадоў навука толькі назапашвала веды ў гэтай галіне, каб дамагчыся больш-менш адэкватных ацэнак ва ўстанаўленні факта бацькоўства. Першая гучная экспертыза, праведзеная на постсавецкай прасторы, — гэта даследаванне астанкаў цара і яго сям'і ў Расіі. З гэтага моманту пачалося пераможнае шэсце генетыкі па нашых краінах. Напрыклад, да 90-х гадоў дакладнасць ДНК-аналізу на бацькоўства была 50–80 %, а цяпер — 99,9 %.



**— Тэсты ў вашай лабараторыі лічацца самымі дакладнымі ў Беларусі. На экспертызу да вас можна трапіць па жаданні ці ёсць нейкія абмежаванні?**

— Канешне, можна і па жаданні грамадзян. Праўда, часцей за ўсё мы працуем па рашэнні суда. Суд выносіць яго для ўстанаўлення біялагічнага бацькоўства і спагнання аліментаў з бацькі. Экспертыза даручаецца абласному ўпраўленню ці цэнтральнаму апарату дзяржаўнага камітэта, як правіла, па тэрытарыяльных прыкметах. Да нас, у цэнтральны апарат, паступаюць найбольш складаныя выпадкі. Але грамадзяне могуць звярнуцца і самастойна. Праўда, ёсць умовы: гэта павінна быць добраахвотна і аналізы трэба здаваць асабіста.

**— Вы сказалі, што ў вашу ўстанову могуць накіроўваюць асабліва складаныя выпадкі...**

— Так. Напрыклад, узнікае неабходнасць устанавіць мацярынства. Так здараецца, калі жанчына па якіх-небудзь абставінах нараджала дома ці ў іншым месцы. Гэта даволі простая працэдура. Увогуле, калі справа датычыцца жывых асоб, калі ёсць трыа: маці, бацька і дзіця, гэта адпрацаваная і адносна нескладаная маніпуляцыя. Але існуюць сітуацыі з цяжэйшымі задачамі, якія стаяць перад экспертамі. Самая распаўсюджаная — калі людзі на працягу нейкага часу жывуць у незарэгістраваным шлюбе і нават не задумваюцца аб наступствах. Раптам здараецца, што мужчына гіне ці знікае кудысьці і ўзнікае неабходнасць устанавіць факт бацькоўства пры адсутнасці прыжыццёвых узораў біяматэрыялу. У такіх выпадках мы працуем з узорамі крыві ці гісталагічнага матэрыялу, калі было паталагаанатамічнае даследаванне памерлага або загінулага. Звычайна матэрыялы знаходзяцца ў архівах дзяржаўнага камітэта, альбо гэта могуць быць біялагічныя тканіны, узятыя пры жыцці з мэтай дыягностыкі, напрыклад, біяпсійныя матэрыялы. Мы можам іх атрымліваць па вызначэнні суда. А ёсць сітуацыі, калі няма магчымасці атрымаць біялагічны матэрыял памерлых ці зніклых. Тады нам даводзіцца працаваць з нейкімі рэчамі гэтага чалавека. З потатлушчавых выдзяленняў вылучаем генетычныя характарыстыкі. Натуральна, мы параўноўваем атрыманыя матэрыялы з матэрыялам сваякоў памерлага, каб пераканацца, што гэта не выпадковы чалавек, толькі тады робім высновы. Генетыка як навука ўжо даволі добра развілася, заканамернасці перадачы генетычнай інфармацыі вядомыя, але такія складаныя тэсты робіцца толькі ў нас, у цэнтральным апараце. Гэта вельмі складанае даследаванне, і ў рамках грамадзянскіх спраў яны праводзяцца рэдка.

**— Вы сказалі, што да вас нярэдка звяртаюцца жанчыны, якія жылі ў грамадзянскім шлюбе, і ў іх часта ўзнікаюць праблемы...**

— Гэта датычыцца жанчын, якія пры нараджэнні дзіцяці ў такім шлюбе не рэгіструюць малое на бацьку. Пры расставанні з мужчынам, натуральна, узнікаюць праблемы з доказам бацькоўства. І добра, калі чалавек жывы, можна арганізаваць атрыманне біяматэрыялу. А калі мужчына памёр ці знік? Атрымліваць дапамогу па страце карміцеля можа дзіця, афіцыйна зарэгістраванае на такога чалавека. Таму спачатку трэба даказаць, што памерлы з'яўляецца бацькам малога. Устанавіць у такіх выпадках факт бацькоўства вельмі складана. Добрыя адносіны з мужчынам? Цудоўна. Мы толькі рады. Але зарэгіструйце дзіця на бацьку, бо потым эксперты не заўсёды змогуць вам дапамагчы, асабліва калі адсутнічае біяматэрыял.

**— Ці магчымы памылкі пры ацэнцы генетычнай экспертызы?**

— Аб'ектыўна кажучы, мы не можам гарантаваць дакладнасць матэрыялу, атрыманага з архіваў моргаў і бальніц. Упэўнена можна казаць пра тыя матэрыялы, якія атрымалі ў сваёй лабараторыі і рух якіх ад адбору экспертызы можам адсачыць. Але ўсе факты мы ўлічваем.

Бо бывае, што два мужчыны з падобнымі генетычнымі характарыстыкамі маглі зачаць адно дзіця. У нас такі быў выпадак. Жанчына спачатку прыходзіла з адным мужчынам, які па нашай схеме мог быць бацькам малога, а потым — з другім, які... таксама мог быць бацькам. Аказалася, гэтыя мужчыны былі блізняты, а вызначыць у такіх выпадках, хто ж з іх бацька, вельмі складана. Бывае, што самі людзі свядома здзяйсняюць падробкі. Напрыклад, у нас тут адзін мужчына абураўся: маўляў, як вы маглі пацвердзіць маё бацькоўства, я ж набраў у рот чужой сліны! Але ж, каб не памыліцца, мы робім не адзін тэст. Розныя гісторыі бываюць. Памятаю мужчыну, які прыйшоў рабіць экспертызу ў адносінах да дзіцяці сяброўкі. Мы зрабілі выснову, што гэта не яго дзіця. Але праз два дні пасля атрымання экспертызы ён зноў звярнуўся да нас. Аказваецца, яго сяброўка змяніла словы ў выдадзеным ёй экзэмпляры экспертызы, і атрымалася, што бацька яе малога — ён. Мы праправерылі дакумент і раскрылі падман.

**— Колькі каштуе такі тэст?**

— Каля 300 рублёў, калі гэта стандартная тройка — маці, тата і дзіця. Тэсты праводзім па дзвюх крыніцах — аналізе крыві і сліны. Чым больш складанае даследаванне, тым даражэй гэта каштуе. Калі яго прызначае суд, то кошт практычна не змяняецца, але плаціць чалавек, прызначаны судом, — як правіла, гэта той, хто заявіў пра неабходнасць тэсту. Вынікі аналізу гатовы звычайна праз месяц.

**— Гэта даволі даступна... А як жа барацьба паміж свякроўю і нявесткай? Ці звярталіся па экспертызу жанчыны, каб даведацца дакладна, што нявестка не падманула сына?**

— Канешне, былі і неспакойныя бабулі, якія хацелі прынесці ўзоры біяматэрыялаў унука і свайго сына. Мы ў такіх выпадках адмаўляем у экспертызе, бо працуем з матэрыяламі, добраахвотна прадстаўленым канкрэтнымі людзьмі са згоды ўсіх бакоў ці па рашэнні суда. Мы робім усё магчымае, каб дапамагчы людзям даведацца праўду, але толькі ў рамках закона.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# «УСЁ Ў НАС БУДЗЕ!»

## «ТАКІХ, ЯК ВЫ, ШМАТ»

Заходзім з фатографам у новенькі дом, які яшчэ мае спецыфічны пах навабудоўлі. У дамафон не званію, бо яго пакуль няма. Але ёсць код, які Юля даслала мне, каб беспярэшкодна дабрацца да яе жылля. Дзверы адчыняе дзіця. Маладая прыгожая жанчына строга глядзіць на малых, якія без яе дазволу ўпусцілі гасцей, але хутка жаночы твар змякчаецца, маці ўжо абдымае хлопчыка, які правініўся. Праходзім у пакой з адной невялічкай канапай і маленькім ложачкам.

— Многія лічаць, што дзяржава раздае кватэры бясплатна і такім чынам прывучае шматдзетных да ўтрымання, — пачынае Юля. — Але гэта не так. Дзяржава дапамагае шматдзетным набываць жыллё, а не дорыць кватэры. Мы з мужам шмат працуем, каб выплачваць доўг па крэдыце. Кожны месяц мы вяртаем у банк каля 550 рублёў. І гэта не першы наш крэдыт...

Юля пазнаёмілася з будучым мужам пасля першай сваёй буйной пакупкі — машыны. Маладая дзяўчына толькі атрымала правы кіроўцы і набыла старэнькае аўто ў крэдыт. У той жа дзень паехала на сваёй машыне на Мінскае мора, дзе і сустрэла яго.

Пажаніліся ў 2010 годзе і сталі жыць у бацькоў Юлі ў трохпакаёвай кватэры. Тут трэба адзначыць, што Юліны бацькі ў маладую сям'ю са сваімі парадамі не лезлі, каб не напалохаць маладых і не вымусіць іх з'ехаць на здымнае жыллё.

«Мы, вядома, адразу сталі на чаргу як маладая сям'я, але разумелі, што чакаць давядзецца доўга. Я зацяжарала, і ў нас з мужам, натуральна, узнікла жаданне жыць асобна ад бацькоў. Хацелася мець свой уласны кут — і мы рашыліся. Гэта была сапраўдная аперацыя па здабыванні грошай. Прадалі машыны, пазычылі ў сяброў пэўную суму, каб купіць хоць аднапакаёўку. Але грошай усё роўна не хапала. Вырашылі ўзяць крэдыт».

Здавалася, мара спраўдзілася: ёсць аднапакаёвая кватэра, але маладыя не змаглі сабе дазволіць у яе пераехаць — проста не хапала заробку і на сціплае жыццё, і на аплату крэдыту. На сямейным савеце вырашылі здаваць набытую кватэру, каб трошкі разлічыцца з крэдытам.

«Спачатку было вельмі цяжка фінансава, — кажа Юля. — Толькі праз два гады ўдалося пераехаць ва ўласнае жыллё. Мы былі



шчаслівыя! Праз пяць гадоў пасля набыцця кватэры цалкам разлічыліся з крэдытам. Мне даводзілася працаваць у дэкрэтным водпуску, але інакш было не выкруціцца».

Пасля нараджэння трэцяга дзіцяці Аляксея сям'я стала лічыцца шматдзетнай і, натуральна, пайшла ставіцца на чаргу, якую называюць «ільготнай».

«Памятаю, нам сказалі ў выканкаме: маўляў, не спадзявайцеся атрымаць жыллё хутка — такіх, як вы, шмат, таму прапаноў у наступныя два гады не чакайце... Але мы не падалі духам — два гады не такі ўжо вялікі тэрмін».

## НЕ ЎСЁ ТАК ПРОСТА

Самае галоўнае для Юлі было не праспаць садок.

«Дождж, снег, вывяржэнне вулкана, ды ўсё што заўгодна, — але галоўнае — адвесці малых у сад. У аднапакаёвай кватэры вельмі няпроста арганізаваць парадак. Калі дома знаходзіліся ўсе дзеці, я практычна нічога не магла зрабіць па гаспадарцы».

Спачатку ў пакоі па перыметры стаялі ложкі для дзяцей, канапа для дарослых і іншая мэбля. Але з нараджэннем чацвёртага малога бацькі зразумелі, што трэба больш папрацаваць над арганізацыяй прасторы. Так быў замоўлены прыгожы трох'ярусны ложачак, «як у дзіцячым садку».

Пакуль дзеці былі малыя, Юлі здавалася, што месца ў кватэры дастаткова. Але





чым даўжэй яны жылі ў аднапакаёўцы, тым часцей прыходзіла ўсведамленне, што дзецям і дарослым у адным пакоі цесна. А больш за ўсё маладая мама баялася зламанага ліфта.

«Мы жылі на восьмым паверсе. Памятаю, сапсаваўся ліфт, а мне з малым у паліклініку трэба. Добра, што іншыя дзеці былі ў садку. Сама цяжарная, ледзь дацягнула каляску да першага паверха. Патэлефанавала ў ЖЭС, пакінула заяўку і сысціла ў паліклініку. Вяртаюся — не працуе ліфт. Думаю, я, пакуль спускалася, ледзь не нарадзіла, а тут — падняцца. Людзі на рабоце, ніхто не дапаможа. Зноў тэлефаную ў ЖЭС, пытаюся ў іх, колькі давядзецца чакаць. А яны мне ў адказ: маўляў, а чаго вы ходзіце невядома дзе? Бачыце, ліфт не пра-



цуе — не выходзьце з дому, а прадукты наступны раз набывайце з запасам. Я так раззлавалася, што сказала: калі праз 20 хвілін ліфт не будзе працаваць, выклікаю МНС сабе ў дапамогу. У выніку на працягу паўгадзіны праблема была вырашана».

Перыядычна сям'я глядзела на сайце выканкама, як рухаецца чарга на жыллё. Здавалася, што вельмі павольна. Але ў адзін цудоўны вясновы дзень з выканкама патэлефанавалі і сказалі рыхтаваць дакументы.

«Званок быў настолькі нечаканы, што я разгубілася і некаторы час не магла нічога рабіць. Памятаю, сядзела на канапе і спрабавала ўсвядоміць, што гэта адбываецца тут і цяпер».

Савічавы «паляцелі» ў выканкам з дакументамі. Але там іх чакала расчараванне. «Нам прапанавалі трохпакаёвую кватэру без адстройвання ў раёне, вельмі далёкім ад кватэры маёй мамы, якая нам моцна дапамагала. Да таго ж, мы разумелі, што рамонт не пацягнем. Муж ўвесь час на рабоце, я — з чатырма дзецьмі... Ды і дзе грошы на гэта ўзяць?»

Сям'я напісала адмову ад кватэры і новую заяву на кватэру з адстройваннем. Пасля гэтага зноў апынуліся ў канцы чаргі на жыллё.

## ПРАЗ ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Праз дзевяць месяцаў пасля першай спробы пабудаваць Савічавым патэлефанавалі зноў.

«Мы радаваліся, але ўжо было не столькі эмоцый. Па ідэі, нам павінны былі пракрэдытаваць 120 метраў — на кожнага члена сям'і па 20 метраў, але паколькі мы сваімі сіламі пабудавалі аднапакаёўку, то ў нас колькасць яе метраў адмінусавалі. Таму ў выніку нам крэдытавалі 88 метраў, і адпаведна, на кожны метр дзяржава выдзяляла крыху больш за 700 рублёў. А кошт метра складаў больш за тысячу».

Розніцу трэба было кампенсаваць уласнымі сродкамі. Сям'я звярнулася ў банк, каб узяць крэдыт на неабходную суму — 46 тысяч рублёў. Але аказалася, што яны, па падліках банка, неплацежаздольныя. «Мы вельмі хваляваліся. Атрымалася, што калі падзяліць наш сукупны даход на ўсіх членаў сям'і, мы недацягваем да крэдыту».

**«Многія лічаць, што дзяржава раздае кватэры бясплатна і такім чынам прывучае шматдзетных да ўтрымання, — пачынае Юля. — Але гэта не так. Дзяржава дапамагае шматдзетным набываць жыллё, а не дорыць кватэры».**

Юля з мужам вырашылі зноў пераехаць да бацькоў, каб уключыць у сукупны даход сродкі ад здачы сваёй аднапакаёўкі. Не хапала зусім трошкі. Тады Юля выйшла на работу на чвэрць стаўкі, і нарэшце сумы даходу стала хапаць. Банк іх пракрэдытаваў.

«Калі пачулі аб станоўчым рашэнні, умомант усе праблемы забыліся, адчувалі толькі радасць і надзею, што ўсё наладзіцца».

Праз чатыры гады сям'я нарэшце пабудавалася. У студзені Савічавы пераехалі ў дзве новенькія кватэры з адстройваннем. Вось яны, уласныя 100 метраў на адной пляцоўцы! Так, канешне, маладым хочацца хутчэй купіць мэблю і кухню, але не ўсё адразу, трэба выплачваць крэдыт і на нешта жыць. Юля ўпэўнена, што праз некаторы час у іх усё будзе, бо галоўнае — ёсць дах над галавой.

«На самай справе, дапамога дзяржавы ў будаўніцтве жылля вельмі істотная. Я ведаю, што людзі дзесяцігоддзямі стаяць на чарзе, каб мець магчымасць пабудавацца. Нам жа давялося чакаць усяго чатыры гады. Набыць жыллё на другасным рынку для нас наогул было б нерэальна», — кажа яна.

У новенькай кватэры здаецца, што чуваць рэха. Пакоі пакуль амаль пустыя, затое на падаконніку горда сядзіць мэйкун — кошка. Дзеці пацягнулі гасцей праз калідор у ванны пакой, каб паказаць новых членаў сям'і — двух кацянят, якія сядзелі за трубамі, але нават у такой вялікай кватэры ад дзяцей ім не схавацца.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.**



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# У фантазіі няма меж, у фінансаў — ёсць

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Увогуле прапісваць і планаваць свае кароткатэрміновыя фінансавыя мэты лепш за ўсё ў пачатку года. Тады вы зможаце бачыць агульную карціну выдаткаў, якія чакаюць вас і вашу сям'ю ў найбліжэйшыя месяцы. Напрыклад, тут будуць зборы дзяцей у школу, ваш адпачынак ці яшчэ нешта. Калі з мэтай вызначыліся, то самы час перавесці яе ў фінансавы эквівалент, то-бок прыкінуць, якія сумы вам неабходныя для ажыццяўлення задуманага.

Безумоўна, фантазія часам не мае меж, але ўсё ж адчуваеш сябе больш камфортна і ўпэўнена, калі рэальна глядзіш на рэчы. Пры пастаноўцы фінансавых мэт можна скарыстацца спецыяльнай тэхнікай SMART, якая грунтуецца на алгарытме з пяці крокаў. За кожным з іх стаіць адно з патрабаванняў ацэнкі вашай мэты.

1. *S — Specific* (у перакладзе: канкрэтнасць і яснасць) — ваша мэта павінна быць актуальная, дакладная. Тут вельмі да рэчы спытаць сябе: што мы хочам атрымаць/змяніць/палепшыць? Ці менавіта мы самі жадаем гэтага?

2. *M — Measurable* (вымяральнасць) — тут будуць тыя самыя лічбы, на прыкладзе якіх вы тлумачыце сабе, як дасягнуць і ў які тэрмін здзейсніць сваю задумку. У гэтым кантэксце актуальныя будуць пытанні: чаго і ў якой колькасці мы хочам? Калі менавіта зможам зрабіць выснову, што мэта дасягнута? Напрыклад, паўгода адкладаць па 100 рублёў, каб купіць новы ноўтбук.

3. *A — Achievable* (дасягальнасць) — мэта павінна быць амбіцыёзная, але і рэальная. Думаць трэба і пра тое, што можа дапамагчы дасягнуць жаданага, а ў чым крыецца перашкода. Проста пажадаць зарабіць мільён — мэта нядрэнная, але ацаніць, ці хопіць для рэалізацыі мары вашага прафесіяналізму, часу і здароўя, будзе таксама не лішнім.




4. *R — Relevant* (узгодненасць, важнасць) — мэта павінна быць сугучная вашым каштоўнасцям, поглядам і перакананням. Бо наўрад ці вы пойдзеце працаваць, напрыклад, на кіруючую пасаду, калі вам такі занятак дасць не раўнавагу і задавальненне, а толькі перспектыву зарабляць больш. Для чаго патрэбна рэалізаваць такую мэту? Тое ж вывучэнне замежнай мовы можа адкрыць перспектыву знайсці работадаўца не толькі ў сваёй краіне ці проста павысіць вашу каштоўнасць як супрацоўніка на цяперашнім месцы работы.

5. *T — Time bound* (вызначанасць па часе) — варта наглядна ўявіць, за які тэрмін нам рэальна ажыццявіць запланаванае і атрымаць прамежкавы ці канчатковы вынік. Дату вызначаеце вы, адштурхоўваючыся ад сваіх магчымасцей і абставін. Упэўнены, што зможаце за некалькі гадоў назбіраць на першапачатковы ўзнос, каб распачаць будаўніцтва жылля, — тады плануйце на пяць гадоў. Дэдлайн у любой сферы матывуе на дзеянні.

## ПАМІЖ «ХАЧУ» І «МАГУ»

— Самыя распаўсюджаныя памылкі пры пастаноўцы фінансавых мэт, як паказвае практыка, — няправільнае ўяўленне пра бюджэт і няўменне прагназаваць усе нюансы. Людзі проста кажуць «хачу кватэру, адпачынак, аўтамабіль», але не маюць элементарнага ўяўлення пра кошт. А насамрэч — гэта асноўнае, таму што толькі разумеючы, якая сума патрэбна для рэалізацыі свайго жадання, мы зможам дзейнічаць і разумець, у які кірунку рухацца, — кажа **фінансавы кансультант Святлана МУРАШКА.** — Умоўна: ёсць у нас сям'я, якая хоча палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Мэта доўгатэрміновая, і, як мы разумеем, з часам некаторыя акалічнасці тут могуць змяняцца — жыллё падаражэе ці стане таннейшае. Аднак, што б ні адбывалася, у самым пачатку варта вызначыцца, якую кватэру мы хочам купіць. У якім горадзе, з якой колькасцю пакояў, з якім рамонтам і планіроўкай і г. д. І толькі потым можна на тых жа сайтах з нерухомасцю паглядзець кошт такога жылля і зразумець, наколькі для нас рэальная такая пакупка. Проста сядаем і ў нататніку альбо ў табліцы Excel прыкідваем суму і перыяд, за які рэальна на яе зарабіць, назбіраць. Тады ўжо дакладна можна зразумець, падсілу нам дасягнуць жаданага альбо трэба разглядаць іншыя варыянты.

Калі з глабальнымі і вялікімі фінансавымі мэтамі ўсё больш-менш зразумела, то як быць, напрыклад, у сітуацыях, калі нашы ўласныя дзеці патрабуюць купіць дарагі падарунак? Тут ёсць свае нюансы. Бо часта жаданне дзіцяці займець нейкую цацку, рэч прадыктавана рэкламай, парадамі сяброў. Аднак не заўсёды такія запыты супадаюць з фінансавымі магчымасцямі сям'і. Як жа ў такім выпадку дзейнічаць? Адмаўляць ці дамаўляцца?

Спецыяліст адзначае, што «змагацца з дзіцячымі «хачу» вельмі складана. Але калі дзіця выхоўваецца ў тым ліку і фінансава, то з ім можна абгаворваць такія сітуацыі. Напрыклад, сын ці дачка ходзяць з бацькамі ў краму, і там ім тлумачаць, што і чаму купляюць бацькі. Так у дзяцей фарміруецца ўспрыманне таго, як робіцца выбар тавараў, як суадносяцца якасць і цана. Тое ж самае і з сітуацыяй, калі дзеці актыўна ўдзельнічаюць у планаванні сямейнага бюджэту. Тады ў іх ёсць магчымасць разумець, на што будуць выдаткоўвацца грошы ў наступным месяцы. Усе гэтыя працэсы адназначна вельмі дапамагаюць пры ўзнікненні спантаннага жадання набыць нешта папулярнае, моднае. Бо вы з вашым дзіцем размаўляеце на адной мове, і ў такім выпадку лягчэй растлумачыць яму, якія могуць быць варыянты для здзяйснення пакупкі. Напрыклад, можна на дамовіцца, што будзеце разам адкладаць грошы пэўны час, альбо купіце рэч на нейкае свята ў падарунак. Ваша пазіцыя павінна наглядна дэманстраваць: вось такія сумы нам спатрэбяцца, таму вось ад гэтага давядзецца адмовіцца. І потым разам ужо ў працэсе абмеркавання можна прыняць сумеснае рашэнне, як дзейнічаць далей».

## СТАЎКА НА ЭМОЦЫІ?

Між тым у наш час, калі раптам узнікае жаданне нешта набыць, людзі часта звяртаюцца ў банк па крэдыты. У такой магчымасці ёсць як прыхільнікі, так і тыя, хто катэгарычна супраць. Бо крэдыты бываюць розныя. І, як паказвае практыка, не заўсёды мэтазгодна імі карыстацца. Напрыклад, наўрад ці варта браць на сябе такога кшталту грашовыя абавязацельствы, калі вам хочацца стаць уладальнікам самай новай мадэлі мабільнага тэлефона. Гэта нерaзумна з пункту гледжання фінансавых паводзін. А вось іншая сітуацыя: сям'я хоча палепшыць жыллёвыя ўмовы. Муж і жонка падлічваюць свае заробкі і разумеюць, што купіць сваю кватэру ці пабудаваць дом за кошт зберажэнняў змогуць гадоў праз дваццаць. Тады, магчыма, і варта звярнуцца ў банк па крэдыт. Хоць працэнты там не малыя, але ж на карту пастаўлены камфорт сям'і, які адбіваецца і на здароўі, і на эмацыянальным фоне...

— Што датычыцца пакупак, тут я заўсёды кажу пра эмацыянальны складнік. Калі, скажам, вы купілі новы гаджэт і радуецеся яму пару дзён, а потым на змену эйфарыі прыходзіць сумная думка пра крэдыт, які трэба аддаваць, то ўзнікае пытанне: якую эмоцыю вы купілі? Я ў такім кантэксце магу прывесці свой прыклад — набыццё бесправаднога пыласоса. Ён з'явіўся ў мяне пяць гадоў таму, але да сённяшняга дня я шчаслівая. Купляць варта доўгатэрміновыя эмоцыі. Зразумела, кожная сітуацыя мае свае нюансы. Аднак крэдыт ці растэрміноўка неабходныя толькі ў тым выпадку, калі мы набываем вырашэнне нейкай сапраўднай праблемы, і яно радуе нас доўгі час, — дзеліцца думкамі Святлана Мурашка.

Фінансы ў кантэксце нашых патрэб і жаданняў — тэма сапраўды важная, якая патрабуе індывідуальнага і граматнага падыходу, каб дасягнуць вынікаў і застацца ў плюсе.

**Алена ДРАПКО.**

---

Друкуецца ў «Алесі»

# ВАЛЕРЫЯ АРЛАНАВА: «МОЙ ЛЮБІМЫ РЭЖЫСЁР — МОЙ МУЖ...»



Упершыню пра актрысу загаварылі пасля выхаду фільма «Павадыр» у 2001 годзе, хоць дэбютавала Валерыя Арланава ў кіно яшчэ ў 1992-м, студэнткай Беларускай акадэміі мастацтваў. За гэтыя гады — сотні сыграных роляў, яркіх і незабыўных вобразаў у тэатры і кіно.

У сакавіцкім нумары «Алесі» — лаўрэат міжнародных тэатральных фестываляў і кінафестываляў, вядучы майстар сцэны Тэатра кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Валерыя Арланава. У інтэрв'ю актрыса расказала, якіх герояў ёй цікава іграць, што мацней за ўсё стымулюе да работы, ці плакала яна з-за роляў, як гэта — быць замужам за рэжысёрам і што яна шануе ў сваёй прафесіі. «Акцёрства як горб, — лічыць гераіня, — ад яго і хацеў бы, але не пазбавішся. Хоць у апошні час у мяне з'явіўся новы запал. Змагаюся з глабальным пацяпленнем: высаджваю кветкі і дрэвы на грамадскай клумбе каля дома».

## ЖРЫЦЫ ЕЖЫ

Ці задумваліся вы, што нашы адносіны з ежай падобныя да нашых адносін з роднымі і партнёрамі? Хочацца, каб яна заўсёды была даступная, асабліва калі нам дрэнна.

У дачыненні да ежы ўвогуле шмат розных пачуццяў узнікае. Крыўда, што смажаная бульбачка такая смачная і немагчыма спыніцца. Злосць на піражнае, што дадае лішнія кілаграмы. Сорам, што падчас багатай вячэры зноў пераеў. Страх, што не хопіць ежы. Віна ад думкі, што мы прыносім неспакой навакольным сваімі «харчовымі паводзінамі».

А на самай справе гэта натуральная патрэба, задавальненне якой выклікае радасць. Што ж перашкаджае нам будаваць з ежай нармальныя адносіны? Здаровае стаўленне да ежы — гэта магчымасць творчасці, аналізу і выбару. Яно зусім не падобна на неўсвядомленае і некіраванае паглынанне ўсяго без разбору альбо на жорсткія абмежаванні з пагрозай для жыцця.



Як наладзіць такія адносіны з ежай, каб яны прыносілі радасць і задавальненне? Гэтак жа, як і любыя іншыя адносіны: адчуць сябе, выбудаваць межы з асяроддзем (аддзяліць сябе ад іншых, каб не есці «за кампанію»). Першае, што неабходна, — гэта развіць цялесную адчувальнасць (адрозніваць голад, насычэнне, агіду). Другое — «прапампаваць» эмацыянальную ўсвядомленасць (умець разбірацца, што мы адчуваем у кожны канкрэтны момант). Трэцяе — перагледзець перакананні, якія адносяцца да харчовых паводзін, але састарэлі і перашкаджаюць знізіць вагу. Падыйсці да гэтага працэсу творча, з цікаўнасцю, знайсці аднадумцаў.

Каб даведацца, ці ёсць у вас расстройства харчовых паводзін, «Алеся» падрыхтавала тэст. А пра спосабы выбудаваць здаровае стаўленне да ежы расказала Таццяна Левіна, дзіцячы, падлеткавы і сямейны псіхолаг, гештальт-тэрапеўт.

## КАБ РЫБУ ЕСЦІ, ТРЭБА Ў ВАДУ ЛЕЗЦІ

Занятак рыбнай лоўляй вядомы на нашых землях з часоў палеаліту: да распаўсюджання земляробства гэта была адна з асноўных крыніц існавання мясцовага насельніцтва. Пра тое сведчаць і знаходкі археолагаў на стаянках першабытных людзей: касцяныя кручкі, вастрыі гарпуноў, рыбіны косткі, сеткавыя грузілы. Выявы



рыб сустракаюцца на тагачасных рэчах і ўпрыгажэннях. Косткамі замест іголак раней сшывалі адзенне, а з пазванкоў вялікіх рыб жанчыны рабілі пацеркі і завушніцы. Мабыць, такія ўпрыгажэнні былі нечым большым, таму што, паводле балта-славянскай міфалогіі, рыба — выразнік мужчынскага пачатку, яна атаясамліваецца з апладняльнай стыхіяй вады. Эратычнашлюбная сімволіка рыбы тлумачыцца і ў славянскіх сонніках. Усім вядома: калі маладая жанчына пабачыць у сне вялікую рыбіну, то хутка зацяжарае і народзіць сына, калі дробную — то дзяўчынку. Калі ж тое бачылася пажылым людзям, гэта прадракала хваробу, бо рыба была яшчэ і адзнакай свету мёртвых.

Рыбалоўныя прылады здаўна ў нашых мясцінах былі вельмі разнастайныя. Яны падзяляліся на невады, сеткі, стаўныя пасткі, рухомыя пасткі, кручковыя снасці і ўдарныя прылады; таксама вылучалі зімовыя і летнія рыбалоўныя прыстасаванні. Многія з іх цяпер можна ўбачыць толькі ў музеях. Больш цікавінак, а таксама рэцэпты беларускіх рыбных страў чытайце ў матэрыяле этнографа Ларысы Мятлеўскай.

## Акушэр-гінеколаг Наталля ЛЕЛЮХ:

# «Культывуючы страх старасці, кампаніі атрымліваюць звышпрыбыткі»

**УКРАІНКА Наталля Лелюх — урач-акушэр-гінеколаг, заснавальніца «Жаночага клуба» і славуты блогер, вядомы як «доктар Наташа». Яна шмат ездзіць па розных краінах з адукацыйнымі семінарамі, дзе расказвае пра цяжарнасць і роды, бясплоднасць, невыношванне і эстэтычную гінекалогію, а таксама развенчвае распаўсюджаныя міфы пра жаночае здароўе. Яе семінары называюць «жывымі», бо 40 % часу — адказы на асабістыя пытанні ўдзельніц. У Мінску семінары з удзелам Наталлі Лелюх арганізуе сацыяльны інфармацыйна-адукацыйны праект «Радзіны». Мы распыталі вядомага ўрача пра тое, што больш за ўсё турбуе жанчын на постсавецкай прасторы і што варта палепшыць у рабоце гінеколагаў, а таксама ці можна амаладзіцца з дапамогай шырока прадстаўленых сёння паслуг эстэтычнай гінекалогіі.**



***— Наталля, вы шмат ездзіце з адукацыйнымі семінарамі і пастаянна павышаеце сваю кваліфікацыю...***

— ...і такім чынам я праследую дзве мэты: самаадукацыя і адукацыя тых, каму не абыякавае сваё здароўе. Сам па сабе «Жаночы клуб» стаў цудоўным месцам — сюды прыходзяць не толькі пацыенты, але і ўрачы, інтэрны, студэнты-медыкі. Адны — пераняць шаблоны для тлумачэння складаных тэм сваім пацыентам, іншыя — каб зразумець унікальнасць пабудовы і работы нашага цела. А я маю магчымасць «не засохнуць» і пастаянна самаадукоўвацца, шукаючы адказы на пытанні.

***— Чым праблемы жанчын постсавецкай прасторы адрозніваюцца ад запытаў да ўрача-гінеколага ў Еўропе?***

— Паколькі мая аўдыторыя — у асноўным выхадцы з постсавецкай прасторы, то пытанні часцей падобныя. За мяжой ёсць адрозненне ў доступе да першаснай кансультацыі доктара, нязначныя ў тым, як урачы кантактуюць і тлумачаць праблему пацыенткам. І я заўважыла яшчэ адно адрозненне — жанчыны постсавецкай прасторы маюць больш ўзровень базавай трывожнасці. Гэта адлюстроўваецца або ў залішнім імкненні ўсё прафілактаваць і абследаваць, або, наадварот, нічога не бачыць, не ведаць і жыць у няведанні.

***— Што найбольш хвалюе жанчын па тэме жаночага здароўя ва Украіне і Беларусі?***

— На першым месцы — праблемы бясплоднасці і невыношвання цяжарнасці. Асабліва для жанчын пасля 35. У апошнія дзесяцігоддзі жанчыны ўсё далей адкладваюць першую цяжарнасць. З гэтым і звязаны страхі, перасцярогі, навязаныя міфы і рэальныя праблемы. Радуе тое, што ўсё больш запытаў па размаўлянасць пра жаночую сексуальнасць, пра ўплыў гармонаў на жыццё і здароўе, пра кантрацэпцыю і менапаўзу.

***— Над чым, на ваш погляд, варта працаваць медыцынскаму персаналу, каб палепшыць дапамогу жанчынам?***

— Найбольшая колькасць праблем узнікае на ўзроўні камунікацыі — недагаварылі, не зразумелі адно аднаго, не захацелі ці не паспелі агучыць сваю пазіцыю. Таксама ёсць вялікая праблема ў адсутнасці паняцця «юрыдычная абарона» — як урачоў, так і пацыентаў. Нас не павінны стукаць ілбамі журналісты. Любыя канфлікты і спрэчныя сітуацыі павінны разбірацца ў юрыдычным полі, цывілізавана, з работай над памылкамі, а не з прыніжэннем, звальненнем і замоўчваннем праблемы. Канешне, мы яшчэ доўга будзем разграбаць агрэхі нашай медыцынскай адукацыі і ментальных установак кшталту «я захварэў, а доктар павінен мяне лячыць».

І немалаважнай праблемай, на мой погляд, з'яўляецца выгаранне ўрачоў. З гэтым увогуле ніхто не лічыцца і няма сістэмнай стратэгіі па яе перааддоленні.

***— Калі закранаць тэму цяжарнасці і родаў, што найбольш хвалюе жанчын?***

— Падрыхтоўка да цяжарнасці, акушэрская агрэсія і камерцыялізацыя працэсу. Мяне радуе, што жанчын усё больш хвалююць пытанні лайфстайлу — харчавання, набору вагі, спартыўных нагрузак. У мяне ёсць прыклады, як мае цяжарныя пераплывалі Басфор на 12-м тыдні і танцавалі на пілоне да 36 тыдняў. Канешне, ёсць запыт па «страхах» і «пужалках» у выглядзе матачнага тонусу, прыёму лекаў, «шкоды» ўльтрагуку і іншых традыцыйных пытанняў пры цяжарнасці. Па тэме родаў больш за ўсё хвалююць абязбольванне, медыцынскія маніпуляцыі, падрыхтоўка да працэсу.

***— У Беларусі ў апошнія гады змянілася і сістэма допуску ў радзільныя дамы, і самі роды. У прыватнасці, у раддамы стала прасцей трапіць родным, стала больш партнёрскіх родаў, у тым ліку і з доўламі, а жанчыны ўсё часцей складаюць «план родаў», дзе выкладаюць свае пажаданні. А якая сітуацыя з гэтым ва Украіне?***

— Апошнія пяць гадоў ва Украіне можна смела назваць бумам партнёрскіх родаў. Партнёр — гэта не заўсёды муж: гэта можа быць сяброўка, мама, доўла. Гэта той чалавек, які забірае на сябе трывогу і кантроль, дазваляе жанчыне не замарочвацца дробнымі праблемамі. Таксама ў нас ёсць практыка хатніх радзільных зал у раддоме, калі ўрача завуць пры жаданні парадзіхі. Гэта дамашнія роды, але на бяспечнай медыцынскай тэрыторыі. Канешне, гучыць ідэальна, але на практыцы бываюць нюансы. Нам яшчэ доўга ламаць стэрэатыпы савецкага акушэрства. Радуе, што пачалі.

***— Ці трэба, на ваш погляд, жанчыне рыхтавацца да родаў — наведваць, напрыклад, курсы? Або дастаткова кансультацый урача, які вядзе цяжарнасць? Якая павінна быць фізічная актыўнасць цяжарных?***

— О, на гэтыя пытанні я адказваю на 4-гадзіннай лекцыі. Ведаеце, што мяне здзіўляе? Тое, што з'яўляецца нормай, — фізічныя практыкаванні, ёга, спа-працэдуры, масаж — варта даказваць ёмістымі і маштабнымі навуковымі працамі. Тое, што маме адразу пасля родаў патрэбна дзіця, а дзіцяці — мама, а не плянёнкі і ўзважванне, — даводзіцца даказваць гадамі, ламаючы стэрэатыпы.

***— Вы ўдзельнічаеце ў семінарах па эстэтычнай гінекалогіі. Наколькі гэта з'ява распаўсюджана на постсавецкай прасторы? Ці варта звяртацца да працэдур амаладжэння і ў якіх выпадках?***

— Ёсць такая паважаная арганізацыя, як FDA (Food and drug administration) у ЗША, якая ў 2019 годзе ў кансэнсусным рашэнні па менапаўзе ў загадным парадку абавязала клінікі і прадаўцоў паслуг antiage (*антыўзроставых.* — **«Зв».**) не выкарыстоўваць слова «амаладжэнне», бо яно з'яўляецца выключна маркетынгавым. Амаладзіць немагчыма. Можна палепшыць якасць жыцця, але не амаладзіць! На семінары па эстэтычнай гінекалогіі мяне запрашаюць у якасці «Бабы Ягі», якая імкнецца ўнесці здаровы сарказм і доказную базу ў цемрашальства продажаў і звышпрыбыткаў, якія атрымліваюць, культывуючы наш страх старасці.

***— Чаго вы пажадаеце жанчынам?***

— Любіць сябе і жыццё.

**Алена КРАВЕЦ.**

Фота носіць ілюстрацыйны характар.





#яжмаці!

# РУЖОВЫ СЛОН

**У звычайны вясновы дзень у наш дом прыбыў госць — хросная мама Улі і Мішы. Некалі яна жыла ў суседнім раёне, днямі вярнулася з Кітая і прыехала да дзяцей з маленькімі падаруначкамі. Мішу дастаўся нанапрусак — гэта такая пластмасавая цацка, падобная на прусака, якая неверагодна хутка бегае. Міша быў задаволены. Адзінаццацігадовай Аляксандры падарылі ўпрыгажэнні для валасоў. Дзяўчынка любіць такія рэчы і таксама была вельмі задаволеная, пакуль не дасталі падарунак для пяцігадовай Улі — ружовага слана! Гэта быў дзіцячы наручны гадзіннічак: бранзалет у выглядзе ружовага слана, а ў пузік устаўлены звычайны гадзіннік. Яго лёгка можна дастаць, і тады застаецца адзін ружовы слон з дзіркай у жывоціку. Саша страціла цікавасць да заколак і ўважліва глядзела, як Уля гуляе са сваёй новай цацкай. Назірала, хмурылася і маўчала. Калі хросная пайшла, старэйшая дачка кінулася да мяне:**

— Маам, ну навошта Улі гадзіннік? Яна ж нават не разумее, для чаго ён. А мне трэба! Я сачыла б па ім за часам і ведала, калі ў школе пачнецца перапынак.

Уля адчула, што пакваліліся на яе падарунак, і прыціснула гадзіннічак да грудзей.

— Улечка, ну калі ласка, — узмалілася Саша. — Я табе аддам упрыгажэнні, хочаш? Магу яшчэ што-небудзь... Глядзі, ты ж хацела лакі для пазногцяў. Выбірай! Фламастары, алоўкі, пластылін — бяры ўсё. Дай мне гадзіннічак.

Уля на імгненне засумнявалася, але хутка сцяміла: раз за гэтую рэч даюць столькі ўсяго, значыць, яна каштоўная.

— Не дам, — упэўнена адрэзала яна. — Мама, а можна я яго ў садок вазьму і пакажу сяброўкам?

Гэта быў гадзіннічак Улі, і яна мела права ўзяць яго. Я так разважала. Хоць сумнявалася, разумеючы, што Уля не вельмі асцярожная і, хутчэй за ўсё, зламае яго ў першы тыдзень карыстання. Паспрабавала яе папярэдзіць, але малая вельмі прасіла...



На наступны дзень, калі я прыйшла па Улю ў садок, малая кінулася да мяне, рыдаючы ўголас. Потым дастала са сваёй шафы ружовага слана з дзіркай у жываце. Там не было гадзінніčка.

— Я не ведаю, як ён згубіўся... А-а-а-а...

—Уля!.. — толькі выдыхнула я.

Калі мы зайшлі дамоў, з пакоя выбегла старэйшая дачка. Уля, убачыўшы яе, зноў зарыдала. Саша паглядзела на мяне, потым на Улю, якая ўжо даставала з кішэні ружовага слана... Гэта адбылося ў адно імгненне. Сашка схапіла Улю і моцна штурханула яе. Тая ўпала на падлогу і стала гучней галасіць.

Саша закрыла твар рукамі, заплакала і пабегла ў пакой. Уля не хацела ўставаць. Яна ляжала на падлозе і рыдала там яшчэ гадзіну. Саша не выйшла вячэраць.

На наступны дзень я прыйшла ў садок па малую і ўбачыла, што дзеці ў групе незвычайна мокрыя і брудныя. Уля кінулася да мяне з вялізнымі, шчаслівымі вачыма і раскрыла сваю далонь. На бруднай далоні ляжаў гадзіннічак.

— Мама, я яго знайшла! Мы разам аблазілі ўсе лужыны. Паслухай, ён яшчэ цікае, не зламаўся!

Дадому мы амаль беглі. Уля схапіла ўсё ў пакой, дастала з-пад падушкі ружовага слана, хутка ўставіла гадзіннік і кінулася да Сашы.

— Сашка, на, бяры! Дару табе!

Саша сядзела за сталом і рабіла ўрокі. Яна ўважліва паглядзела на Улю і трохі падумаўшы, адказала:

— Не, Уля, дзякуй. Гэта ж ТВОЙ падарунак. Прабач мяне.

Дзяўчынкі абняліся... А ружовы слон яшчэ доўгі час валяўся ў цацках, бо сёстры страцілі да яго ўсякую цікавасць.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский радиозавод» (продавец) извещает о проведении 8 апреля 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение лотов: г. Гомель, ул. Объездная, 9** | | | |
| 1 | **Станок токарно-винторезный 250ИТВ (инв. № 2322)**, г. в. 1991 | 5 840,00 | 584,00 |
| 2 | **Станок токарно-винторезный 250ИТВ (инв. № 2442)**, г. в. 1994 | 1 680,00 | 168,00 |
| 3 | **Пневматический пресс НВ5222Б-01 (инв. № 686)**, г. в. 1973 | 3 360,00 | 336,00 |
| 4 | **Автомат для холодной навивки пружины АА5214А (инв. № 1772)**, г. в. 1982 | 780,00 | 78,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский радиозавод», г. Гомель, ул. Объездная, 9. Порядок **ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 544-38-37 – Титков Виктор Семенович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 марта 2020 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 6 апреля 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах по лотам №№ 1, 2, 3 размещено в газете «Звязда» от 17.01.2020 г. № 10 (29124), по лоту № 4 от 18.01.2020 г. № 11 (29125). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

### проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Брестский электроламповый завод»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»** | | | | | |
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-78562, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Московская, 208Б. Площадь – 192,2 кв.м. Наименование – здание склада для хранения стеклотрубки. Назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции. Составные части и принадлежности: откр. склад д/обор., навес, два забора, двое ворот. Лампы накаливания в ассортименте согласно спецификации.<br>Земельный участок с кадастровым номером 140100000001032151, площадью 0,5043 га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия – по 22.08.2046). На земельном участке установлены следующие ограничения: водоохранная зона р. Мухавец, вне прибрежной полосы, площадь 0,5043 га | | | | |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20 %), BYN** | 210 141 руб. 53 коп. | **Задаток, BYN** | 21 014 руб. 15 коп. | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | **ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1. тел.: 8 017 284 94 32, факс: 8 017 286 76 80** | | | | |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | **ОАО «Брестский электроламповый завод»<br>224020, г. Брест, ул. Московская, 204, тел.: +375 162 35 64 04, факс: +375 162 35 64 29** | | | | |
| **Сведения о представителях Продавца для осмотра/ознакомления с предметом аукциона** | Грунтова Александра Петровна, тел. +375 44 580 63 02 | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, оплата вознаграждения** | Победитель аукциона в течение 3 (трех) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка производится нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: в белорусских рублях: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 14 апреля 2020 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **20 апреля 2020 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, Инновационный центр «Горизонт» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения повторного аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей» | | | | | |

**Дополнительная информация по тел. +375 17 284 94 32. E-mail: arenda@horizont.bn.by**

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Айфономания. Тур 3»

Наименование рекламной игры: «Айфономания. Тур 3».
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 17 февраля 2020 года по 24 марта 2020 года.
В рекламной игре приняли участие 80 682 человек.
Призовой фонд игры разыгран полностью.

**Обладателями приза: Смартфон Apple iPhone 11 PRO Max 64 GB Midnight Green, Model A2218, MWHH2RM/A + денежное вознаграждение в размере 369,38 (триста шестьдесят девять) белорусских рублей 38 копеек стали:**

1. Лушкинов Юрий Васильевич, г. Минск;
2. Селявко Светлана Михайловна, д. Курганы;
3. Огородников Дмитрий Олегович, г. Минск;
4. Подолицкая Евгения Владимировна, д. Боровляны;
5. Мешковский Олег Владимирович, г. Минск.

**Обладателями приза: подарочный сертификат на покупку товаров в интернет-магазине e-dostavka.by, номиналом 50 рублей. Срок действия 13.03.2020–12.04.2020 стали:**

1. Романова Светлана Владимировна, г. Минск;
2. Галуза Сергей Михайлович, г. Минск;
3. Комягина Таисия Михайловна, г. Минск;
4. Харичева Мария Владимировна, г. Минск;
5. Конончик Надежда Ивановна, п. Колодищи;
6. Кибак Анастасия Ивановна, д. Рахманьки;
7. Залозная Ольга Сергеевна, г. Брест;
8. Данилович Екатерина Николаевна, г. Минск;
9. Лушкинов Юрий Васильевич, г. Минск;
10. Синкевич Наталья Анатольевна, г. Минск;
11. Гаврилова Светлана Петровна, г. Минск;
12. Макаревич Алеся Николаевна, г. Минск;
13. Никишина Ирина Васильевна, аг. Сеница;
14. Вашкевич Юрий Игоревич, г. Минск;
15. Микульчик Алина Александровна, г. Минск;
16. Курбанова Эльмира Телларовна, г. Минск;
17. Железняк Артём Владимирович, г. Минск;
18. Пинчук Юлия Владимировна, г. Минск;
19. Полуда Алиса Сергеевна, г. Минск;
20. Скоренко Татьяна Николаевна, г. Минск;
21. Боровая Ольга Сергеевна, г. Минск;
22. Хамзех Элина, г. Минск;
23. Бузановский Константин Викторович, г. Минск;
24. Алиева Лина Юрьевна, г. Минск;
25. Мельникова Ольга Андреевна, г. Минск;
26. Русак Мария Михайловна, г. Минск;
27. Полещук Анжелика Анатольевна, п. Привольный;
28. Залмовер Анатолий Исаакович, г. Минск;
29. Горегляд Елена Васильевна, д. Боровляны;
30. Козельская Татьяна Павловна, г. Минск;
31. Ворона Валера Петрович, г. Витебск;
32. Третьякова Алла Викторовна, г. Бобруйск;
33. Лысак-Валентюкевич Андрей Аркадьевич, Минск;
34. Ковалёва Диана Сергеевна, Барановичи;
35. Яголович Марина Викторовна, Минск;
36. Котова Дарья Владимировна, г. Минск;
37. Селявко Светлана Михайловна, д. Курганы;
38. Писаренко Ольга Григорьевна, г. Минск;
39. Ловгач Анастасия Викторовна, г. Минск;
40. Гомалинская Екатерина Семеновна, г. Минск;
41. Заенчковский Геннадий Валентинович, г. Столин;
42. Чалей Роман Александрович, г. Минск;
43. Кучинский Сергей Леонидович, г. Минск;
44. Науменко Константин Николаевич, д. Станьково;
45. Бондарева Юлия Николаева, г. Минск;
46. Хальцов Андрей Дмитриевич, г. Минск;
47. Романова Наталья Дмитриевна, д. Дайнова;
48. Гурин Вадим Иванович, г. Минск;
49. Груша Татьяна Анатольевна, г. Минск;
50. Гарачун Анна Вацлавовна, г. Минск.

Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», УНП 191728827, Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3741 от 07.02.2020 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 17 363 12 78.

**Общее собрание кредиторов**

## ОАО «Трест Белтрансстрой»

**по вопросу утверждения изменений в план санации**

ОАО «Трест Белтрансстрой» состоится **27.03.2020 в 11.00** в актовом зале ГХУ Управления делами Президента Республики Беларусь по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 39 (малый актовый зал).
С планом санации ОАО «Трест Белтрансстрой» кредиторы могут ознакомиться после опубликования на официальном сайте ОАО «Трест Белтрансстрой» **www.trestbts.by**

УНП 100120922

## СПИСОК ПОБЕДИТЕЛЕЙ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Смарт-призы от 21vek.by»

1. ООО «Триовист», Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2 эт.;

2. «Смарт-призы от 21vek.by»;

3. Срок начала Рекламной игры: 5 февраля 2020 года;
Срок окончания Рекламной игры: 6 апреля 2020 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

| № Розыгрыша | Дата и время проведения | Участвуют Участники, выполнившие условия, указанные в п.7 настоящих правил в период с … по … |
|---|---|---|
| 1 | 20.02.2020 года, 16.00 | с 05.02.2020 по 17.02.2020 (включительно) |
| 2 | 05.03.2020 года, 15.00 | с 18.02.2020 по 02.03.2020 (включительно) |
| 3 | 05.03.2020 года, 16.00 | с 05.02.2020 по 02.03.2020 (включительно) |

4. Свидетельство № 3734 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 22 января 2020, выданным Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

5. Сведения о количестве участников рекламной игры:
Розыгрыш № 1 – 205 человек,
Розыгрыш № 2 – 316 человек,
Розыгрыш № 3 – 521 человек

6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:
Призовой фонд разыгран полностью.

7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши);

| Номер розыгрыша | Наименование приза | Ф.И.О победителя(ей) |
|---|---|---|
| 1 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Хальчицкий Виталий Анатольевич |
| 1 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Ледник Виктор Михайлович |
| 1 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Пенкрат Виктор Викторович |
| 1 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Шмарловская Марина Сергеевна |
| 1 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Шелюк Александр Александрович |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Хомякова Юлия Олеговна |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Кравченко Иван Владимирович |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Ворончук Татьяна Владимировна |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Салата Сергей Викторович |
| 2 | Беспроводные наушники Apple AirPods with Charging Case, Model: A2032 A2031 A1602, MV7N2RU/A | Зуева Татьяна Витальевна |
| 3 | Смартфон Apple iPhone 11 64GB Green, Model A2221, MWLY2RM/A | Коронevич Максим Александрович |

8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 44 501-21-31.

УНП 191112533

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
## по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 21 апреля 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-136* | ул. Рыбницкая, микрорайон «Заболоть» | 0,0972 | 440100000002010142 | 3 064,55 | 16 665,25 | 3 400 |

